ЛЮДЗІ З ІНВАЛІДНАСЦЮ: КУДЫ ЗВЯРТАЦЦА ПА ДАПАМОГУ? 8

РАМАНТЫКА І ПРАГМАТЫКА ЯЎГЕНА ПЕРЛІНА 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 ЛІПЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 140 (28756)

ЛІЧБА ДНЯ

38-е месца

займае Беларусь у рэйтынгу ААН па ўзроўні развіцця электроннага ўрада. Наша краіна перамясцілася на 11 радкоў уверх у параўнанні з вынікамі 2016 года. У рэйтынгу прадстаўленыя 193 краіны. Беларусь упершыню ў сваёй гісторыі перамясцілася ў групу краін (топ-40) з вельмі высокім індэксам развіцця электроннага ўрада. На першым месцы глабальнага рэйтынга ААН апынулася Данія. У топ-10 краін уваходзіць Аўстралія, Рэспубліка Карэя, Вялікабрытанія, Швецыя, Фінляндыя, Сінгапур, Новая Зеландыя, Францыя, Японія. Рэйтынг складаецца ААН раз у два гады. У 2016 годзе Беларусь была на 49-м радку, у 2014 годзе — на 55-м.

КАРАТКА

• Тэрмін бязвізавага знаходжання замежных грамадзян у Беларусі павялічаны да 30 сутак пры ўмове іх уезду ў краіну і наступнага выезду праз дзяржаўную мяжу ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. Адпаведны Указ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 24 ліпеня. (Падрабязнасці на сайце www.zviazda.by.)

• **Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў чэрвені 2018 года склала BYN953,7.**

• Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў 24 ліпеня павіншаваў Героя Беларусі старшыню СВК «Прагрэс Верцялішкі» Васіля Равяку з 70-годдзем.

• **Беларускія верталётчыкі ўзялі першае золата чэмпіянату свету па верталётным спорце, які праходзіць пад Мінскам.**

ISSN 1990 - 763X

ЭНЕРГЕТЫЧНАЯ РЫБАЛКА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рэактар, «парахавая бочка» і запалкі ў куні

СЁННЯ Ў БЕЛАРУСІ АДЗНАЧАЕЦЦА ДЗЕНЬ ПАЖАРНАЙ СЛУЖБЫ

165 гадоў споўнілася з таго часу, як у Мінску была створана першая прафесійная дружына, якая змагалася з пажарамі. Недахопу работы ў іх не было ніколі. Гэты дзень — нагода для таго, каб пагутарыць з ратавальнікам. У паслужным спісе Івана ЛАПКОЎСКАГА — цэлы россып медалёў і спіс грамат. За кожнай узнагародай стаяць выратаваныя ім чалавечыя жыцці...

— Тое, што я стаў пажарным — па сутнасці, справа выпадковая. Пасля дзясятага класа паступіў у фізкультурны тэхнікум у Гродне на спецыяльнасць «лёгкая атлетыка і лыжы». Да таго два гады прафесійна займаўся зімовымі відамі спорту. Як бачыце, ну зусім нічога агульнага з пажарнай справай няма.

СТАР. 12

■ Жніво-2018

БЛІЗКІЯ ДА ПЕРШАГА МІЛЬЁНА

Плануецца, што аграрыі збяруць яго да канца гэтага тыдня

У краіне ўжо практычна сабралі першы мільён тон збожжа. Па аператыўнай інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, 24 ліпеня ўбрана 951,1 тысячы тон збожжавых культур, што складае 15,5 % ад усёй уборачнай плошчы. Сярэдняя ўраджайнасць — 28,8 ц/га. Плануецца, што мільён тон будзе сабраны да канца гэтага тыдня.

Брэстчына лідзіруе

Варта нагадаць, што сёлета масавая ўборка пачалася раней у параўнанні з мінулым годам. У жніве лідзіруе Брэсцкая вобласць, дзе сабралі 446,4 тысячы тон збожжавых і зернебабовых культур пры сярэдняй ураджайнасці ў 29,1 ц/га. Следам ідзе Гродзенская вобласць. Там хлебаробы намалацілі 264,6 тысячы тон збожжа. На трэцім месцы размясцілася Мінская вобласць з ураджаем 133,4 тысячы тон. Чацвёртую пазіцыю займае Гомельшчына, дзе ўбралі 94,3 тысячы тон збожжавых і зернебабовых. Аграрыі Віцебскай і Магілёўскай абласцей сабралі 10,93 тысячы тон і 1,8 тысячы тон адпаведна. Лідзіруюць па ўраджайнасці гаспадаркі Гродзенскай вобласці, дзе ў сярэднім яна склала 31,8 ц/га.

Першыя экіпажы-тысячнікі

Першы экіпаж-тысячнік на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур ужо з'явіўся ў Брэсцкай вобласці. Прычым экіпаж сямейны — Валерый і Таццяна Кухты намалацілі больш за 1050 тон у ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна.

СТАР. 3

ХУТЧЭЙ, ВЫШЭЙ... АЛЕ ПА ПРАВІЛАХ

Беларусь — за чысціню і празрыстасць у спорце

Такую пазіцыю агучыў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з генеральным сакратаром Міжнароднай федэрацыі баскетбола (ФІБА) Патрыкам Баўманам.

У пачатку сустрэчы Прэзідэнт павітаў госця ў Беларусі, а таксама падзякаваў яму за тое, што нашай краіне даручылі правесці сусветнае першынство. «Пакуль — сярод моладзі. Я думаю, мы сябе добра зарэкамендуем у арганізацыі гэтага чэмпіянату, і вы нам даверыце больш складанае мерапрыемства», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар са свайго боку гарантаваў поўную цікавасць гледачоў да любога мерапрыемства, што праводзіцца пад эгідай Міжнароднай федэрацыі баскетбола, а таксама ўсё неабходнае для правядзення спаборніцтваў высокага ўзроўню.

«Я думаю, кіраўнік нашай федэрацыі (баскетбола. — **«Зв.»**) вам расказаў пра нашы магчымасці, пра лагістыку, якую мы маем, — адзначыў Прэзідэнт. — І вы будзьце ўпэўненыя: калі мы за нешта возьмемся, то зробім на самым высокім узроўні, бо да гэтага заўсёды далучаюцца дзяржаўныя органы, структуры, і любое мерапрыемства ў нас па любым відзе спорту — гэта падзея дзяржаўнага маштабу».

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз падкрэсліў: у Міжнароднай федэрацыі баскетбола могуць быць спакойныя за арганізацыю любога мерапрыемства, якое будзе даручана беларускаму боку.

Таксама Аляксандр Лукашэнка выказаў уласную пазіцыю як кіраўніка Нацыянальнага алімпійскага камітэта па важных, надзённых пытаннях развіцця сусветнага спорту ў цэлым.

«Мы — за чысты спорт, мы — за поўную празрыстасць і чысціню дзейнасці міжнародных арганізацый, у тым ліку і Міжнароднага алімпійскага камітэта, — падкрэсліў беларускі лідар. — Мы — прыхільнікі абароны спартсменаў, каб яны не пакутавалі, асабліва чыстыя спартсмены. Нельга вінаваціць у цэлым каманду, мы лічым, што кожны спартсмен павінен несці персанальную адказнасць за допінг і іншыя неспартыўныя паводзіны. Словам, мы за празрыстасць Сусветнага антыдопінгавага агенцтва і іншых міжнародных спартыўных камітэтаў, і перш за ўсё — МАК».

Прэзідэнт таксама адзначыў, што ў Беларусі вельмі шмат прэтэнзій да Міжнароднага алімпійскага камітэта. На яго думку, гэтая арганізацыя не проста бюракратычная, а часам і безадказная.

Як кіраўнік НАК Аляксандр Лукашэнка плануе на чарговым мерапрыемстве давесці гэта да ведама міжнароднай спартыўнай грамадскасці. «Нельга цалкам ператвараць спорт у частку бруднай палітыкі. Мы катэгарычна супраць гэтага. Спорт павінен быць чысты, падыход да ўсіх павінен быць аднолькавы», — зноў падкрэсліў Прэзідэнт.

Патрык Баўман адзначыў, што для яго гэтая сустрэча — падвойны гонар, паколькі ён сустракаецца не толькі з Прэзідэнтам краіны, але і з кіраўніком Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Ён падзякаваў Беларусі і асабіста Аляксандру Лукашэнку за тую падтрымку, якая аказваецца пры правядзенні чэмпіянату свету па баскетболе сярод дзяўчат да 17 гадоў.

«Мы адзначаем той прагрэс, якога ўжо дасягнула жаночая зборная Беларусі па баскетболе», — сказаў Патрык Баўман. Ён падкрэсліў: зыходзячы з таго, што ён убачыў, усе працуюць выключна добра, а чэмпіянат ужо можна назваць паспяховым.

«Калі мы пяройдзем да тэмы Сусветнага антыдопінгавага агенцтва, то я абсалютна падзяляю ваш пункт гледжання аб тым, што мы павінны абараняць чысты спорт і чыстых спартсменаў», — дадаў генеральны сакратар.

Пазней у размове з журналістамі Патрык Баўман адзначыў, што ён сапраўды ўражаны арганізацыяй турніру. Паводле яго слоў, узровень мерапрыемства прыемна здзівіў і каманды. «Апошні раз я быў у Мінску 20 гадоў таму, і мне вельмі радасна бачыць, як змяніўся горад, як тут добра», — адзначыў генеральны сакратар.

У Беларусі ёсць усе шанцы для правядзення маштабных мерапрыемстваў у гэтым відзе спорту, дадаў Патрык Баўман. Для гэтага створана цудоўная інфраструктура, ёсць федэрацыя, у якой працуюць прафесіяналы. «Мы будзем толькі рады, калі Беларусь будзе падаваць заяўкі на правядзенне больш буйных турніраў», — дадаў ён.

Нагадаем, з 21 да 29 ліпеня ў беларускай сталіцы праходзіць чэмпіянат свету па баскетболе сярод дзяўчат да 17 гадоў. Спаборніцтвы сусветнага ўзроўню ў гэтым відзе спорту Беларусь прымае ўпершыню ў сваёй гісторыі.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

БЕЗ БАЛАСТУ

З 1 верасня ў Акадэміі кіравання непатрэбных у кіраванні людзей вучыцца не павінна

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка перад тым, як заслухаць даклад аб выкананні даручэнняў па ўдасканаленні дзейнасці гэтай ВНУ.

«Прызначаючы новага рэктара, мы дамаўляліся пра тое, што істотна адновім работу Акадэміі кіравання па ўсіх кірунках, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба зрабіць так, каб кожны чалавек, які пройдзе падрыхтоўку, перападрыхтоўку, атрымае адукацыю, павысіць кваліфікацыю ў Акадэміі кіравання, быў запатрабаваны».

Беларускі лідар падкрэсліў: не патрэбны людзі, якія проста пройдуць па Акадэміі, атрымаюць дыплом і не будуць запатрабаваны ў органах кіравання. «Вы самі разумееце, што гэта адзіная навучальная ўстанова пры Прэзідэнце. Там павінны быць падрыхтаваны кваліфікаваныя, разумныя, выхаваныя людзі, адданыя нашай дзяржаве і народу. Няхай тое нават гучна прагучыць, але гэта так», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На нарадзе прысутнічалі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава, міністр адукацыі Ігар Карпенка і рэктар Акадэміі кіравання Генадзь Пальчык. Прэзідэнт нагадаў ім, што да верасня яму павінны ўнесці прапановы па ўдасканаленні навучальнага працэсу. «Па асобах, якіх мы будзем туды запрашаць для навучання па ўсіх кірунках. Па выкладчыках: якія крытэрыі і патрабаванні, унесці прапановы па выкладчыцкім складзе — калі ўжо прапрацавана, спешкі тут быць не павінна, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Па методыцы выкладання, па рознага роду метадычных матэрыялах. Цэлы комплекс адукацыйны — і па ім павінны быць прапановы».

Беларускі лідар звярнуўся да прысутных з наступнымі пытаннямі: што зроблена на сённяшні дзень і што неабходна яшчэ зрабіць, якія патрэбны дапамога і падтрымка? «Часу для разварушвання няма. З 1 верасня ў Акадэміі кіравання непатрэбных у кіраванні людзей быць не павінна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Як расказаў Генадзь Пальчык, кіраўніцтвам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь была праведзена наступная работа. Па-першае, быў дапрацаваны дзяржаўны заказ на падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі кіруючых кадраў, а таксама асоб, уключаных у рэзервы кіруючых кадраў, на новы навучальны год.

У Акадэміі вывучылі патрэбу дзяржаўных органаў і арганізацый у адпаведных спецыялістах. Аб'ёмы падрыхтоўкі неабходных прафесіяналаў былі скарэктаваны на падставе маркетынгавых даследаванняў. Быў спынены набор на перападрыхтоўку кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, па дзяржаўным заказе па дзесяці спецыяльнасцях.

Пазаўчора ў лік студэнтаў залічана 100 чалавек. Прахадны бал на дзённую форму навучання за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту на спецыяльнасць «дзяржаўнае кіраванне і права» склаў 343 балы (у 2017 годзе — 338), «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» — 336 балаў (291 — у папярэднім годзе), «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» — 341 (310 — у 2017-м). Плануецца, што ў будучым годзе абітурыентам акрамя цэнтралізаванага тэсціравання неабходна будзе праходзіць і гутарку, што падтрымаў і Прэзідэнт, — пры ўмове, што праходзіць яна будзе празрыста.

Важна, што сярод першакурснікаў 84 % — іншагароднія. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на гэты аспект, паколькі такія студэнты ведаюць жыццё не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах і малых населеных пунктах. Абмяркоўвалі і матэрыяльна-тэхнічную базу — не толькі Акадэміі кіравання, але і ўсіх ВНУ. Беларускі лідар запатрабаваў прывесці ў парадак інтэрнаты і сталовыя.

Дарэчы, асабліва кіраўнік дзяржавы адзначыў, што выпускнікі Акадэміі кіравання павінны быць выключнымі, бо ў будучыні яны сфарміруюць кіраўнічы склад краіны. І яшчэ адно патрабаванне Прэзідэнта: навучальныя працэсы ў кожнай ВНУ трэба аптымізаваць на прыкладзе Акадэміі, нідзе не павінна быць нічога лішняга, пры гэтым да падрыхтоўкі кадраў трэба падыходзіць без фармалізму.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Домрачава стала першым зорным паслом

Фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» абвясціў аб запуску інфармацыйнага праекта «Зорныя паслы II Еўрапейскіх гульняў»

Першым уладальнікам гэтага тытула стала чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка Дар'я Домрачава. Сертыфікат аб прысваенні звання зорнага пасла вядомай спартсменцы ў зале Алімпійскай славы Нацыянальнага алімпійскага камітэта ўручыў дырэктар фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Георгій Катулін.

Домрачава адзначыла, што для яе вельмі ганарова стаць першым зорным паслом буйнога турніру. Дар'я не сумняваецца, што на II Еўрапейскіх гульнях павінны заззяць новыя зоркі спорту, якія пасля будуць успамінаць беларускую сталіцу як горад, у якім яны дамагліся сваіх першых вялікіх поспехаў.

Георгій Катулін падкрэсліў, што прыярытэтнымі задачамі праекта з'яўляюцца прасоўванне і фарміраванне станоўчага іміджу II Еўрапейскіх гульняў у Беларусі і за яе межамі, прыцягненне да іх грамадскай увагі, стымуляванне цікавасці жыхароў Беларусі і сусветнай грамадскасці да мультыспартыўнай падзеі, папулярызацыя відаў спорту, уключаных у праграму Еўрапейскіх гульняў.

У лік зорных паслоў увойдуць выдатныя асобы са свету спорту, мастацтва і культуры не толькі Беларусі, але і замежных краін. Услед за Дар'яй Домрачавай сертыфікаты зорных паслоў II Еўрапейскіх гульняў атрымаюць вядомыя цыркавыя артысты браты Запашныя.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

З-за лясных пажараў пад Афінамі загінулі дзясяткі чалавек

Лясныя пажары ў прыгарадзе Афін за суткі забралі жыцці па меншай меры 50 чалавек (сярод іх шмат маленькіх дзяцей), больш за 170 атрымалі сур'ёзныя траўмы, паведамляюць Ekathimerini.com і Amna News. Пацярпелі як мясцовыя жыхары, так і турысты ў курортных пасёлках Маці, Рафіны, Неас Вутсас і Пентэлі. Мясцовыя СМІ паведамляюць, што людзі апынуліся заблакаваныя агнём у дамах і аўтамабілях або спрабавалі выратавацца ў моры, але патанулі. Пры гэтым улады не выключаюць, што нейкія пажары ўзніклі з-за падпалаў, што неаднойчы здаралася ў папярэднія гады. У панядзелак таксама падняўся моцны вецер, які паспрыяў распаўсюджванню агню. Дапамогу сваіх ратавальнікаў Грэцыі прапанавалі Кіпр, Ізраіль, Іспанія, Балгарыя, Італія, Германія, Францыя. Агенцтва Reuters адзначае, што гэта самы магутны пажар у краіне з 2007 года, калі выгарэў паўднёвы Пелапанэс.

У Сеуле прапанавалі сёлета афіцыйна завяршыць Карэйскую вайну

Кіраўнік паўднёвакарэйскага міністэрства па справах аб'яднання Чо Мён Гюн заявіў, што, на яго думку, да канца 2018 года магчыма выканаць усе фармальнасці, якія б дазволілі афіцыйна завяршыць Карэйскую вайну. «Ідуць кансультацыі паміж Паўднёвай, Паўночнай Карэяй і ЗША», — адзначыў міністр, словы якога прыводзіць тэлеканал YTN. У той жа час, кажучы аб больш павольным, чым чакалася, прагрэсе ў справе дэнуклеарызацыі Карэйскага паўвострава, Чо Мён Гюн заявіў, што ЗША і КНДР, відаць, патрабуецца больш часу для пераадолення варожасці. Як вядома, актыўныя ваенныя дзеянні на Карэйскім паўвостраве доўжыліся з 1950 да 1953 года, аднак дагавор аб спыненні вайны дагэтуль не падпісаны.

Улады Харватыі спісалі даўгі грамадзян на 178 мільёнаў еўра

Урад Харватыі спісаў даўгі 150 тысяч грамадзян перад падатковымі і іншымі дзяржорганамі на суму 1,3 мільярда кун (каля 178 мільёнаў еўра), заявіў прэм'ер-міністр Андрэй Пленкавіч. Дапамога дзяржавы даўжнікам — фізічным асобам стала магчымая пасля ўступлення ў сілу 21 ліпеня пакета законаў аб фінансавай падтрымцы грамадзян. Гаворка ідзе пра запазычанасць 326,3 тысячы чалавек на агульную суму ў 43,6 мільярда кун (каля 581 мільёна еўра), не лічачы пеняў і працэнтаў. Першымі спісалі даўгі памерам да 10 тысяч кун (каля 1,3 тысячы еўра), з-за якіх раней былі блакаваныя асабістыя рахункі грамадзян.

Утерянные представительством Белгосстраха по Пуховичскому району квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1 СУ серия СВ №№ 2537615–2537620 в количестве 6 шт. **считать недействительными.**

УНП 100122726

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению филиала «Автобусный парк № 2» ОАО «Миноблавтотранс» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания склада инв. № 645/С-6624 общей площадью 520,6 кв. м, расположенного на земельном участке площадью 0,3144 га с кадастровым номером 625250100030000035** (право постоянного пользования) **по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Колхозная, 33.**

Начальная цена с НДС (20 %) – 25 920,00 бел. руб. Стоимость снижена на 80 %. Задаток 10 % от начальной цены (2 592,00 бел. руб.).

Задаток перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона в течение 10 (десять) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 5 (пять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») от 23.09.2017 и газете «Звязда» от 11.01.2018, 26.04.2018. Аукцион состоится **07.08.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.08.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

■ Падрабязнасці

Плаціць за «камуналку» будзем па-новаму. За што і калі?

Асобны кранік на паліў агарода пакуль не запатрабаваны

У апошнія дні чэрвеня ў нашай краіне перагледзелі парадак разлікаў і ўнясення платы за жыллёва-камунальныя паслугі («Звязда» за 6 ліпеня). Дык вось, асноўныя змены ўступілі ў сілу з 1 ліпеня, а асобныя — з 1 кастрычніка.

«Свежыя» жыроўкі атрымаем у жніўні за ліпень

Нагадаем, што з гэтага месяца перагледжаны ў бок павелічэння нарматывы на электраэнергію для тых, чые жылыя памяшканні не абсталяваны сістэмамі цэнтральнага гарачага водазабеспячэння і цэнтралізаванага забеспячэння прыродным газам. Для гэтай катэгорыі нарматыў павышаны да 250 кВт·гадзін. Больш за тое, пры спажыванні ад 250 да 400 кВт·гадзін аплата таксама будзе праводзіцца па субсідаваных тарыфах, але з прымяненнем павышаючага каэфіцыента 1,3. І толькі пры перавышэнні 400 кВт·гадзін плаціць прыйдзецца па эканамічна абгрунтаваных тарыфах.

Таксама пачала працаваць зніжка на ацяпленне ў 10 % на працягу трох гадоў для тых, хто за свой кошт установіць прыборы індывідуальнага ўліку расходу цеплавой энергіі. А тым, у каго ўжо былі такія лічыльнікі да 1 студзеня гэтага года, але імі не карысталіся, будзе зроблена зніжка ў 5 % на ацяпленне на працягу трох гадоў, калі яны пачнуць аплачваць па прыборах.

З першых дзён ліпеня непрацуючыя пенсіянеры, а таксама тыя, хто мае права на льготы па аплаце жыллёва-камунальных плацяжоў, і інваліды III групы могуць аплачваць паслугі электра- і газазабеспячэння па субсідаваных тарыфах у дачыненні да двух жылых памяшканняў: па адрасе абавязковай рэгістрацыі па месцы жыхарства і рэгістрацыі па месцы знаходжання.

У ліпені, калі б не залевы, мог бы запрацаваць «асобны кранік на паліў агарода». Гаспадары індывідуальных дамоў, якія ўтрымліваюць жывёлу і займаюцца агародам, могуць устанавіць асобны прыбор уліку спажывання вады. Ён будзе кантраляваць расход вады менавіта на паліў і ўтрыманне жывёлы, і гэты аб'ём вады будзе выключацца з платы за паслугу водаадвядзення.

Наступныя змены ўбачым у лістападзе. Калі будзем плаціць за кастрычнік

«Не плаціць за смецце, якога няма» можна будзе з пачатку кастрычніка. Так, уласнікі аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, у якіх ніхто не прапісаны, змогуць на 6 месяцаў у каляндарным годзе прыпыняць аказанне паслугі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі. І, адпаведна, не плаціць за гэта.

Тыя, хто жыве ў інтэрнаце і заключыў дагавор найму жылога памяшкання, за кастрычнік абавязаны ўносіць плату за водазабеспячэнне, водаадвядзенне, электрычную энергію. Гэта датычыцца ў тым ліку спажыванай электраэнергіі на асвятленне дапаможных памяшканняў і работу абсталявання, а таксама санітарнага ўтрымання дапаможных памяшканняў. Увага! У абавязковым парадку трэба будзе плаціць за ўсе паслугі, якія налічваюцца ў залежнасці ад колькасці не зарэгістраваных, а тых, хто пражывае.

Таксама з кастрычніка пачне дзейнічаць новы парадак ліквідацыі дапушчаных выканаўцам памылак, у выніку якіх прыходзіцца дадаткова налічаць плацельшчыку пэўныя сумы. Даналічэнне цяпер магчыма ажыццяўляць толькі за тры месяцы.

Сяргей КУРКАЧ

■

БЛІЗКІЯ ДА ПЕРШАГА МІЛЬЁНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У цэлым жа на Брэстчыне ў лідарах знаходзіцца Брэсцкі раён, дзе ўбрана больш за 57 % плошчаў. Далей па спісе Бярозаўскі (53,5 %), Пружанскі (53 %) і Камянецкі (47,3 %) раёны. Самая высокая ўраджайнасць зафіксавана ў Баранавіцкім раёне (34,9 ц/га). Пры гэтым аграрыі адзначаюць, што для Баранавіцкага раёна гэта невялікая ўраджайнасць. Уборка таксама адрозніваецца і тэрытарыяльна: у паўднёвай частцы ўжо ўбралі збожжа практычна з паловы плошчаў, а паўночныя рэгіёны знаходзяцца толькі на пачатковай стадыі (убрана каля 16 % плошчаў).

Напярэдадні першы ў Мінскай вобласці 1 тысячу тон збожжа намалаціў экіпаж са Слуцкага раёна. Добра папрацавалі **браты Аляксандр і Уладзімір АНЦІПЦАВЫ** з дзяржпрадпрыемства «Саўгас «Рачкавічы» Беларускай чыгункі.

Поўным ходам ідзе ўборачная ва ўсёй Гродзенскай вобласці. У рэгіёне ўжо ўбралі больш за 21 % плошчаў. У лідарах Зэльвенскі (38 %), Свіслацкі (35 %) і Воранаўскі (34 %) раёны. У Гродзенскім і Карэліцкім раёнах з аднаго гектара збіраюць па 45,6 ц і 43,4 ц адпаведна.

Сочаць за тэхнікай анлайн

А ў Мінскай вобласці ў анлайн-рэжыме плануецца адсочваць работу сельгастэхнікі. Як адзначыў **начальнік управаўлення механізацыі і інвестыцый камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама Васіль СЫСОЕЎ,** ноу-хау будзе працаваць з дапамогай датчыкаў сачэння, якія ўсталяваныя на рухавіках трактароў. Гэта дазволіць назіраць за ўзворваннем у анлайн-рэжыме.

Датчыкі дазволяць правесці аналіз загрузкі трактара, ацаніць яго работу, адзначыць, колькі гадзін ён быў у полі, які аб'ём работы выканаў, ці мелі месца прастоі і несанкцыянаваныя аперацыі.

Інавацыя стала магчымай дзякуючы з'яўленню новых трактароў у гаспадарках вобласці: усяго плануецца закупіць 150, з іх 44 ужо паступілі ў распараджэнне гаспадарак.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

■ Спажывец

УРАДЖАЙНЫ ГОД

Нарыхтоўка чарніц выросла ў 6 разоў, а агрэсту — у 11

Сёлетні нарыхтоўчы сезон для Белкаапсаюза складваецца ўдала. Ужо закуплена 1,6 тысячы тон чарніц — гэта ў шэсць разоў больш, чым за ўвесь мінулы год. Мяркуючы па ўмовах надвор'я, чарніцы (разам з дурніцамі) пратрымаюцца да жніўня.

Што датычыцца костачкавых культур (чарэшні, вішні, алычы), то іх прымаць пачалі толькі паўтара тыдня таму, але ўжо нарыхтавана 156 тон (у 1,3 раза больш за мінулагодні аб'ём). Садовых суніц закуплена 1070 тон (на 11 % больш за ўзровень 2017 года), з якіх 590 тон таварных ягад, чырвоных і чорных парэчак — 1113 тон (плюс 20 %), малін — 25 тон (плюс 10 %), агрэсту — 30 тон (у 10,8 раза больш за леташні паказчык).

На закупачныя цэны садовых ягад уплываюць перапрацоўчыя прадпрыемствы, а вось цэны на дзікаслую прадукцыю ў многім вызначаюць экспарцёры.

Цяпер спажыўтаварыствы прымаюць у насельніцтва і рэалізуюць грыбы, маладую бульбу, агуркі, таматы, капусту. У краіне адкрыта 750 прыёма-нарыхтоўчых пунктаў. Закупкі вядуць таксама больш за пяць тысяч крам. У кожным раёне працуе ад трох да дзесяці мабільных пазаштатных нарыхтоўшчыкаў. Каб захоўваць прадукцыю, у сістэме кааперацыі ёсць 297 халадзільных установак агульным аб'ёмам 6,4 тысячы тон. Плюс працуе дзве лініі шокавай замарозкі.

Куды далей ідзе закупленая садавіна і гародніна? 60 % бульбы, напрыклад, рэалізуецца ў рознічнай гандлёвай сеткі і на рынках, 3—5 % адпраўляюць на прамысловую перапрацоўку, 35 % — на экспарт. Што да астатняй гародніны, то 70 % прадаецца ў розніцу, астатняе — на перапрацоўку. Большасць грыбоў (80—90 %) ідзе на прылаўкі краіны. А вось чарніцы амаль цалкам (90 %) пастаўляюць на экспарт.

Спажыўтаварыствы актыўна супрацоўнічаюць з фермерскімі гаспадаркамі.

❍ ЗАКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ *(за кілаграм)*

Яблыкі апад — ад 3 да 5 капеек.
Яблыкі таварныя — ад 60 капеек да 1,2 рубля.
Маліны — ад 1,5 да 2,5 рубля.
Чарніцы — ад 3,5 да 4 рублёў.
Лісічкі — ад 4,5 да 7 рублёў.
Баравікі— ад 5 да 7 рублёў.
Часнок — ад 3,5 да 4 рублёў.

Заключана 560 дагавораў на аб'ём больш за 20 тысяч тон у асартыменце.

— Для нас гэта плюс, бо фермеры вырабляюць сартавую прадукцыю належнай якасці, якая запатрабавана ў тым ліку і за мяжой, — адзначае **начальнік управаўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Аксана СКІНДЭР.** — Работа з гаспадаркамі дазволіла павялічыць асартымент прадукцыі, якую яны вырошчваюць. Раней на тэрыторыі Беларусі мала займаліся зяленіўнымі культурамі, а цяпер штогод аб'ем іх рэалізацыі праз сістэму кааперацыі прырастае на 15—20 працэнтаў. Такіх культур мы прадаём звыш 125 тон за год. Гэта велізарны аб'ем, на мой погляд.

А вось з беларускім часнаком пакуль складана. Па словах Аксаны Скіндэр, шэраг фермераў спрабавалі займацца гэтай культурай, але якасныя параметры, якія назіраюцца пры зборы, вельмі складана захаваць у міжсезонны перыяд. Таму ўзімку на прылаўках часцей бачым кітайскі часнок.

Штогод Белкаапсаюз закупляе сельскагаспадарчай, дзікаслай прадукцыі і другасных відаў сыравіны на 250—300 мільёнаў рублёў. Удзельная вага закупак у насельніцтва — 70—80 %. За прадукцыю і сыравіну насельніцтву штогод выплачваецца больш за 70 мільёнаў долараў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ

■

■ Лета ў горадзе

СУСТРЭНЕМСЯ Ў МУЗЕІ

Зрабіць сумесны вячэрні праменад і прайсці па ўсіх кутках роднай краіны за некалькі гадзін прапануюць ахвотным канал «Культура» Беларускага радыё і Беларускае грамадскае аб'яднанне экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў. 26 ліпеня адбудзецца незвычайная прагулка па сталічным музеі валуноў, межы якога, калі зірнуць на парк плошчай сем гектараў з вышыні, утвараюць контуры Беларусі.

Экскурсію, што пачнецца а 19-й гадзіне, будзе весці майстар экскурсійнай справы Мікалай Чырскі, які раскажа мноства цікавых фактаў і захапляльных легендаў не толькі пра рэшткі ледавіковага перыяду, звезеныя ў музей з розных куткоў Беларусі, але і пра іншыя этапы нашай агульнай гісторыі.

Таксама ў сустрэчы возьмуць удзел творчыя супрацоўнікі радыё «Культура», гатовыя да нефармальных стасункаў са слухачамі.

Папярэдне запісацца на экскурсію можна на афіцыйным сайце канала www.radiokultura.by альбо па рэдакцыйным нумары +375 (17) 284-84-11.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

■

Талісманы Гульняў-2020 у Токіа атрымалі імёны

Сіне-белы алімпійскі талісман Мірайтава і бела-чырвоны сімвал Параалімпіяды Самэйці атрымалі свае імёны па выніках галасавання школьнікаў Японіі.

Акрамя імёнаў і яркага вонкавага выгляду, у абодвух персанажаў ёсць свая гісторыя. Крыніцай натхнення паслужыў японскі фальклор. Імя Мірайтава ўтварылася ў выніку зліцця двух іерогліфаў — «будучыня» і «вечнасць». Сімвал Алімпіяды шануе старажытныя традыцыі, з якіх ён чэрпае веды пра будучыню. Характэрнымі рысамі Мірайтавы з'яўляюцца абвостранае пачуццё справядлівасці і несуцішны запал да спорту. Таксама ён валодае здольнасцю рухацца з небывалай хуткасцю.

Назва талісмана Параалімпіяды Самэйці азначае адзін з відаў квітнеючай сакуры. Характэрна, што яго імя сугучнае з англійскай «so mighty» («такі магутны»). Самэйці вельмі моцны фізічна і духоўна, што робіць яго блізкім з параалімпійцамі, якія любой цаной пераадольваюць перашкоды і пашыраюць межы магчымага. Як і яго сябар Мірайтава, Самэйці валодае экстраардынарнымі здольнасцямі: тэлепатыя, супермоц і ўменне лётаць.

Абодва талісманы жывуць як у лічбавым, так і ў рэальным свеце. Яны перамяшчаюцца паміж светамі дзякуючы інтэрнэту.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 7 (82)

■ Кібербяспека

Канфлікты XXI стагоддзя сыходзяць у інтэрнэт?

Віртуальныя баявыя дзеянні з рэальнымі наступствамі для людзей і інфраструктуры

Здавалася б, няма нічога больш разбуральнага, чым ядзерная зброя. Яе прымяненне гарантуе поўнае знішчэнне, а таксама адсутнасць магчымасці выкарыстоўваць пашкоджаную тэрыторыю. Разам з тым у стагоддзі, у якім шырока выкарыстоўваюцца інфармацыйныя тэхналогіі, у ядзернай боегалоўкі з'явіўся новы сапернік па разбуральнай сіле. Развязванне войнаў на прасторах інтэрнэту можа не проста непапраўна пашкодзіць інфраструктуру, банкаўскую сістэму самых высокаразвітых краін, але і папросту знішчыць іх. Каб стрымліваць «кібератакі» і быць гатовымі да іх, у многіх краінах трацяць вялікія рэсурсы.

ФЕНОМЕН ГЛАБАЛЬНАЙ СЕТКІ

Як адну з разнавіднасцяў інфармацыйных баявых дзеянняў сёння вылучаюць кібервайну. Яна вядзецца электронным спосабам, а ў якасці мэты або інструмента выступае інфармацыя. «Камп'ютарныя салдаты» спрабуюць дэстабілізаваць інфармацыйныя сеткі саперніка, каб атрымаць кантроль над імі альбо выкрасці даныя.

Такая вайна стала магчымая з-за практычна татальнага пранікнення інфармацыйных тэхналогій і інтэрнэту ў грамадства. Сёння ў сеціве абменьваюцца данымі не толькі людзі, але і шэраг камерцыйных прадпрыемстваў, дзяржаўныя ўстановы, якія з'яўляюцца важнымі стратэгічнымі аб'ектамі для краіны. Калі доступ да такой інфармацыі апынецца ў руках, скажам, агента замежнай разведкі, то гэта аўтаматычна можа ўяўляць пагрозу для нацыянальнай бяспекі краіны.

Акрамя таго, ёсць шэраг сістэм ва ўсім свеце, якія становяцца больш аўтаматызаванымі і кіруюцца праз камп'ютары. Гаворка ідзе пра ацяпленне, каналізацыю, сістэму электрычнага забеспячэння (так званы разумны горад). У такіх умовах паспяховая кібернетычная атака можа прынесці шкоду не меншую, чым ядзерная зброя. Адключэнне важных інфраструктурных аб'ектаў можа ўвесці ў хаос цэлыя гарады.

Таксама, акрамя ўзлому і ўкаранення вірусаў у сістэмы, у спецыфіку хакераў можа ўваходзіць і вядзенне інфармацыйнай вайны ў інтэрнэце. Ваенныя спецыялісты ў сферы інфармацыйных тэхналогій могуць таксама займацца фарміраваннем грамадскай думкі праз «ідэалагічныя ін'екцыі» і «тролінг».

СУСВЕТНЫ ВОПЫТ

У Расіі ў студзені 2017 года, міністр абароны Сяргей Шайгу афіцыйна заявіў аб стварэнні ва ўзброеных сілах спецыяльных падраздзяленняў, якія будуць займацца інфармацыйнымі аперацыямі. Такія службы з'явіліся ў многіх краінах свету практычна адразу са стварэннем сусветнай павуціны. Тады яны часта выконвалі спецыфічныя аперацыі пад грыфам сакрэтна. Сёння аб іх працы таксама мала што вядома, аднак дэманстрацыя кібервойскаў становіцца актам ваеннага стрымлівання.

Спецыялісты лічаць, што сёння найбольш падрыхтаваныя і шматлікія кібернетычныя войскі маюць амерыканцы. Згодна з даследаваннем Zecurion Analytics, іх бюджэт складае каля сямі мільярдаў долараў, за якія ўтрымліваюцца 9 тысяч хакераў. Аднак у іх шэрагах, мабыць, чакаецца папаўненне. Напярэдадні кіраўнік Нацыянальнага агенцтва па бяспецы (NSA) ЗША і кіравання кібербяспекі Пол Накасан заявіў, паводле інфармацыі замежных СМІ, аб стварэнні спецыялізаванага падраздзялення для барацьбы з анлайн-пагрозамі з боку расійскіх хакераў. Ён адзначыў, што фарміраванне будзе «адпавядаць» дзейнасці амерыканскай разведкі па даследаванні ўздзеяння на амерыканскія прэзідэнцкія выбары 2016 года.

На другім месцы знаходзяцца кітайскія спецыялісты з 20 тысячамі кібersалдат і бюджэтам у 1,5 млрд долараў. Далей брытанцы, якія за $450 млн утрымліваюць прыкладна больш за 2 тысячы хакераў.

Паўднёвая Карэя ў сваім распараджэнні мае 700 спецыялістаў і бюджэт у 400 мільёнаў долараў. У Расіі колькасць хакераў вар'іруецца ў межах 1 тысячы, а прыблізны бюджэт складае $300 млн у год.

АЙЧЫННЫ ВЕКТАР

Сёння ўсе краіны, якія маюць патэнцыял і магчымасці, спрабуюць стварыць уласныя кібервойскі. Наша не выключэнне. Дакладна сказаць пра колькасць, бюджэт і спецыфіку дзеянняў нашых спецыялістаў складана. Аднак аб іх наяўнасці сведчыць той факт, што падчас беларуска-расійскага вучэння «Захад-2013» адным з такіх падраздзяленняў была змадэляваная сітуацыя маштабнай кібератакі на інфармацыйныя сістэмы і рэсурсы ваеннага прызначэння. Другое падраздзяленне пры гэтым паспяхова стрымлівала навучальнае ўздзеянне.

Акрамя таго, Мінабароны ў 2013 годзе таксама аб'явіла набор кадраў для працы ў сферы інфармацыйных тэхналогій, а ў пачатку 2018 года заявіла аб стварэнні IT-роты. Плануецца, што камплектавацца яна будзе са спецыялістаў Парка высокіх тэхналогій, якія будуць праходзіць тэрміновую службу. Дакладная спецыфіка іх працы пакуль не вызначана і знаходзіцца ў стане фарміравання. Мяркуецца, што яны змогуць удзельнічаць у тым ліку і падраздзяленне ў забеспячэнні абароны інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах.

У ГРАМАДЗЯНСКАЙ СФЕРЫ

Між тым у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі спецыялістаў па абароне інфармацыі падрыхтоўваюць афіцыйна. Гаворка, вядома ж, ідзе аб грамадзянскіх спецыяльнасцях.

Загадчык кафедры абароны інфармацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, доктар тэхнічных навук, прафесар Цімафей БАРБОЦЬКА адзначае, што спецыялісты па інфармацыйнай бяспецы сёння асабліва запатрабаваныя ў банкаўскай сферы. Таксама выпускнікі БДУІРа размяркоўваюцца ў арганізацыі, якія задзейнічаны ў распрацоўцы праграмнага забеспячэння для процідзеяння хакерскім нападам.

«Мы падрыхтоўваем спецыялістаў па інжынерна-тэхнічнай абароне аб'ектаў: перашкаджаем фізічнаму несанкцыянаванаму доступу да інфармацыі. Таксама на кафедры ёсць кірунак па абароне інфармацыі ад уцечкі па тэхнічных каналах. Гаворка ідзе аб інфармацыі, якая прадстаўлена ў выглядзе фізічных палёў, а не нейкага дакумента. Напрыклад, калі мы гаворым пра нараду або пра гутаркі, для таго, каб выключыць перахоп тэхнічнымі сродкамі, трэба забяспечыць адпаведную абарону», — адзначыў Цімафей Барбоцька.

Такія тэхналогіі могуць быць актуальнымі для пасольстваў і консульстваў. Таксама ў БДУІРы ёсць кірункі па абароне інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах — так званая кібербяспека.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

IT-РОТУ СФАРМІРУЮЦЬ У ЛІСТАПАДЗЕ

Сярод крытэрыяў адбору — вышэйшая тэхнічная адукацыя па профільных IT-спецыяльнасцях і добрае здароўе

Рота інфармацыйных тэхналогій афіцыйна з'явіцца падчас будучага восеньскага прызыву. На першым этапе плануецца прызваць два ўзводы агульнай колькасцю ў 40 чалавек. Пра гэта падчас сустрэчы з прадстаўнікамі Парка высокіх тэхналогій паведаміў начальнік Ваеннай акадэміі Віктар ЛІСОЎСКІ. Стварэнне IT-роты абяцае быць узаемавыгадным для ПВТ і Узброеных Сіл. Дзякуючы новаму праекту IT-спецыялісты, якія прызываюцца на тэрміновую ваенную службу, змогуць прыносіць карысць сістэме ваеннай бяспекі. Пры гэтым за перыяд армейскай службы яны працягнуць удасканальваць свае прафесійныя навыкі.

Што будуць рабіць?

Асноўная мэта стварэння IT-роты будзе заключацца ў распрацоўцы праграмнага забеспячэння, спецыяльных і прыкладных праграм сумесна з падраздзяленнямі Ваеннай акадэміі, іншымі навуковымі, навучальнымі ўстановамі.

Фота БелТА.

Сярод праектаў, якімі займаецца акадэмія, ключавое значэнне маюць тыя, што звязаны з мадэляваннем ваенных дзеянняў, навігацыйным забеспячэннем, распрацоўкай аўтаматызаваных сістэм кіравання і радыёлакацыі.

«Задачы ваеннаслужачых новага падраздзялення будуць звязаныя перш за ўсё з матэматычным абгрунтаваннем праектаў і вытворчасцю праграмнага прадукту. Для працы спецыялістам будзе выдзелена самае сучаснае абсталяванне і праграмнае забеспячэнне», — адзначыў Віктар Лісоўскі.

Адбяруць па конкурсе

Рота інфармацыйных тэхналогій будзе камплектавацца ў два этапы. Першы набор адбудзецца ўвосень — гэта 40 чалавек, два ўзводы. Вясной — яшчэ адзін. Усяго — 60 чалавек. Сярод крытэрыяў адбору — вышэйшая тэхнічная адукацыя па профільных IT-спецыяльнасцях.

«Таксама прызыўнікі будуць адбірацца як усе вайскоўцы — па здароўі. У абавязковым парадку праз сістэму ваенных камісарыятаў будуць праводзіцца гутарка, тэсціраванне», — растлумачыў Віктар Лісоўскі.

У выніку патэнцыйным кандыдатам выставяць пэўны рэйтынг, на аснове якога будзе прынята рашэнне аб залічэнні.

Новае падраздзяленне будзе адыгрываць дапаможную ролю. Прызваныя вайскоўцы будуць праходзіць тэрміновую службу як звычайныя салдаты і па заканчэнні навучання атрымаюць ваенна-ўліковую спецыяльнасць аператара ПЭВМ.

Ад навабранцаў патрабуецца веданне хаця б адной аб'ектна-арыентаванай мовы праграмавання, уменне працаваць з сістэмамі кіравання базамі даных. Таксама вітаецца камунікабельнасць і ўменне працаваць у камандзе, ініцыятыўнасць і захопленасць новымі тэхналогіямі.

Праца спецыялістаў будзе арганізавана ў асобнай аўдыторыі з абсталяванымі персанальнымі рабочымі месцамі, якія маюць выхад у глабальную інфармацыйную сетку і аб'яднаных у лакальную інфармацыйную сетку.

Размяшчацца рота інфармацыйных тэхналогій будзе асобна ў складзе падраздзялення. Ад роты штодня прызначаецца толькі ўнутраны нарад у складзе трох чалавек. У іншыя віды нарадаў і каравул асабовы склад роты не назначаецца.

Плануецца, што каля 913 тысяч рублёў выдаткуюць на рамонт рабочых месцаў і казармаў. Тэхнічнае абсталяванне роты абыдзецца ў 280 тысяч беларускіх рублёў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

■ Змена

ВАКАЦЫІ ПА ЎСТАВЕ

19 хлопцаў з Маскоўскага раёна Мінска на 9 дзён перабраліся ў 56-ы асобны полк сувязі ВПС і войскаў ППА. Увесь гэты час яны начуюць у казармах, а камандуюць імі сяржанты тэрміновай службы і афіцэры.

— Мы хочам навучыць юнакоў дзеянням ва ўмовах будучай ваеннай службы, — заўважае **намеснік начальніка палявога вузла сувязі па ідэалагічнай рабоце маёр Сяргей ПАЎЛАЎ.** — Рыхтаваць маральна і фізічна да гэтага іх лепш за ўсё ужо цяпер. Ім ужо ад 14 да 16 гадоў. Будучыя прызыўнікі! Ды і на занятках па дапрызыўнай падрыхтоўцы ім будзе лягчэй.

Праграма для школьнікаў вельмі насычаная. Непасрэдна на тэрыторыі часці яны вывучаюць агульнавайсковыя дысцыпліны: займаюцца страявой, агнявой, тактычнай і інжынернай падрыхтоўкай. Але і культурны складнік таксама вялікі — спланаваны экскурсіі, паходы па месцах баявой славы...

Таксама мы падрыхтуем нашых выхаванцаў да ваеннай эстафеты. Яна ўключае ў сябе дзесяць пунктаў, на якіх прадстаўлены разнастайныя элементы ваеннай справы. Сярод іх — настройка радыёстанцыі, пошук няспраўных катушак, размініраванне ўчастка, разборка-зборка зброі, снараддзянне магазіна, аказанне першай дапамогі, уменне паставіць палатку на некалькі чалавек... Адным словам, усё, што спатрэбіцца ім у будучыні ў войску.

Сярод сяржантаў, якія камандуюць хлопцамі, — толькі максімальна падрыхтаваныя. Двое з іх працавалі з новым папаўненнем і таму атрымалі вялікую практыку ў зносінах з людзьмі, якія да гэтага не мелі дачынення да вайсковай справы.

— Спачатку была ідэя арганізаваць такі лагер для навучэнцаў, якія стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх, — гаворыць **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце сярэдняй школы № 170 горада Мінска Святлана ЖОГАЛ.** — Каб дапамагчы ім арганізаваць сябе, сфарміраваць новыя рысы характару. Але з часам мы сталі набіраць не толькі такіх юнакоў, але і іншых хлопцаў, якія хочуць вызначыцца з прафесіяй, неяк сябе арганізаваць і дысцыплінаваць.

Анвару ХАДЖАЕВУ споўнілася 16 гадоў. У ваенна-патрыятычным лагеры ён упершыню.

— Да гэтага я нёс вахту на Пасту № 1, займаў высокія месцы на конкурсах па страявой падрыхтоўцы. Ёсць думкі паступаць у Ваенную акадэмію. Прыцягвае армейская тэма тым, што служылі брат, бацька і дзед. Таксама ўдзельнічаў у парадзе да Дня Незалежнасці. Калі маршыруеш, то на цябе ўсе глядзяць, і ты адчуваеш вялікую адказнасць. За першы дзень тут я навучыўся прыгожа запраўляць ложак. На страявых занятках мы рэпеціравалі пастраенне. Лягчэй мне і на дапрызыўнай падрыхтоўцы.

А вось пятнаццацігадовы **Сяргей ЦАРЛЮКЕВІЧ** у 56-м палку ўжо другі год запар.

— Летась мне ў школе расказалі пра гэты лагер і спыталі, ці не хачу я сюды з'ездзіць. Я пагадзіўся. І мне спадабалася. Тым больш што дзед — вайсковец, шмат расказваў пра службу. Сябрую і са спортам — ужо даволі даўно займаюся боксам.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

Кампетэнтна

Больш за 150 спартыўна-патрыятычных лагераў арганізуецца сёлета ў Беларусі. Мяркуецца, што ў іх паўдзельнічаюць каля 10 тысяч вучняў. Пра гэта заявіў **начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Уладзімір МАКАРАЎ.**

Іх работа вядзецца па спартыўна-тэхнічным, фізкультурна-спартыўным, ваенна-патрыятычным, абаронна-спартыўным кірунках. Міністэрства адукацыі рэалізуе ваенна-патрыятычныя адукацыйныя праграмы ва ўзаемадзеянні з Мінабароны, МУС, Дзяржпагранкамітэтам і МНС.

ЯК ПАДЛЕТКІ ГУЛЯЮЦЬ У «ЗАРНІЦУ»

У першай палове ліпеня ў краіне традыцыйна праходзіць рэспубліканскі злёт навучэнцаў, які наведваюць класы ваенна-патрыятычнай накіраванасці. Сёлета ён прысвечаны 100-годдзю Узброеных Сіл Беларусі.

Арганізатары, сярод якіх міністэрствы абароны і адукацыі, распрацавалі вялікую праграму злёту. Але самай відовішчнай стала ваенна-спартыўная гульня «Зарніца», якая прайшла на базе 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады.

102 вучні з усіх куткоў Беларусі з'ехаліся на ўскраіну Мінска. Сярод іх шмат дзяўчат. Яны паглядаюць на паласу перашкод, праз якую пабягуць праз паўгадзіны...

— На жаль, надвор'е за ноч сапсавалася. Трава мокрая, зямля мокрая, таму, нягледзячы на ўсё імкненне да перамогі, будзьце гранічна асцярожныя, — праводзіць інструктаж **намеснік камандзіра брыгады па ідэалагічнай рабоце палкоўнік Сяргей КОРНЕЎ.** — Важная поўная ўзаемадапамога, выручка. Будзеце праходзіць паласу перашкод — падайце руку, дапамажыце вылезці свайму калегу. І памятайце: залік ставіцца па апошнім чалавеку. У любым выпадку, незалежна ад выніку, — сваіх не кідаюць.

«Зарніца» — гэта спартыўная эстафета ваенна-палявой накіраванасці. І таму ўсе яе складнікі так ці інакш маюць дачыненне да спецыфікі вайсковай службы. Праўда, праграма яе была даволі спрошчана, паколькі ўсё ж такі дзейныя асобы — школьнікі, а не салдаты.

Цікавімся ў Сяргея Корнева: што ж чакае падлетка ў паласе перашкод?

— Ім трэба будзе перабрацца праз двухметровы роў, прабегчы праз лабірынт, пераадолець разбураную лесвіцу і вылезці з падземнага пераходу. А яшчэ — сабраць і разабраць аўтамат Калашнікава, аказаць параненаму першую дапамогу, надзець агульнавайсковы ахоўны камбінезон, знайсці міну, выканаць сілавыя практыкаванні... Праграма для ўсіх адзіная. Дзяўчаты пройдуць тыя ж выпрабаванні, як і хлопцы. Якіхсьці «льгот» для іх не будзе.

Да старту застаюцца лічаныя хвіліны, але мы паспяваем пагутарыць з некаторымі ўдзельнікамі «Зарніцы».

— Выбраў гэты кірунак, таму што лічу гэта годнай магчымасцю ў будучыні праявіць сябе, — кажа **вучань класа ваенна-патрыятычнага кірунку сярэдняй школы № 27 горада Бабруйска камандзір узвода кадэтаў Ягор РАЎНЕЙКА.** — Я ўжо ў адзінаццатым класе, і таму трэба выбіраць далейшы шлях у жыцці. Дзед мой — падпалкоўнік, служыў у органах унутраных спраў. Збіраюся ў Акадэмію МУС і я. А «Зарніца» — гэта цудоўная магчымасць праверыць сваю фізічную падрыхтоўку і маральныя якасці. Ну і, канешне ж, паступаць трэба ўжо з пэўнымі ведамі, якія спатрэбяцца ў далейшым.

Кадэт, віцэ-малодшы сяржант Мікіта СЯЛЕДЧЫК прыехаў са Слоніма.

— У нас працуе кадэцкі корпус, заснаваны на базе сярэдняй школы № 9. У мяне брат вучыўся ў кадэцкім класе, я пайшоў па яго слядах. Там фарміруюцца дысцыпліна, выпраўка, і хлопчык становіцца мужчынам. Садзейнічае гэтаму і «Зарніца». Думаю паступаць на ваенны факультэт пасля школы, як гэта зрабіў і мой брат.

Гучыць каманда — «На старт! Увага! Марш» — і першыя дзве дружыны ўжо бягуць на паласу перашкод...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«АВТО ОТ МАСТЕРКАРД. АВГУСТ»

1. Организатор Рекламной игры.

Закрытое акционерное общество «Сэлмон-Графикс» (далее – Организатор), УНП 100843219, адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, ком. 43.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является: общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Заинтересованное лицо).

2. Наименование и территория проведения Рекламной игры.

Рекламная игра носит название «Авто от Мастеркард. Август» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.

3. Срок начала и окончания Игры.

Игра проводится с 1 августа 2018 г. по 28 сентября 2018 г. (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

4. Комиссия по проведению Игры.

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав Комиссии:

1. Черненков Павел Леонидович – индивидуальный предприниматель управляющий ЗАО «Сэлмон-Графикс» – председатель Комиссии;

2. Стельмах Александр Петрович – заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа Крама»;

3. Жуковец Василина Сергеевна – ведущий специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

4. Фещенко Юлия Владимировна – начальник отдела продвижения товаров и услуг ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

5. Вишневская Диана Дмитриевна – специалист по работе с клиентами отдела по работе с клиентами № 2 ООО «Сэлмон Медиа»

5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра.

Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard (далее – Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, для оплаты топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».

6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Игры.

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь, являющиеся держателями действующей банковской карты Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro с учетом ограничений, указанных в данных правилах (далее – Участник Игры).

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.

Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

в период с 1 августа 2018 г. по 31 августа 2018 г. включительно совершить покупку топлива по Карте Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт/ Maestro, на АЗС сети ПО «Белоруснефть» на сумму не менее 0,60 белорусского рубля **(шестьдесят копеек)** с использованием зарегистрированной накопительной информационно-учетной карты (в дальнейшем – Карта «Белоруснефть»), которая определяет физическое лицо как участника программы лояльности клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа), проводимой на АЗС сети «Белоруснефть».

Зарегистрированной считается Карта «Белоруснефть» при указании ее владельцем в анкете регистрации следующих данных: фамилии, имени, отчества, даты рождения, номера мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, а также адреса электронной почты.

В Игре не принимают участие покупки, оплаченные частично или полностью, бонусными баллами по банковской платежной карте «Халва Плюс» (в том числе и через карту «ИКС-карта» от ЗАО «МТБанк»).

6.4.Участник Игры может участвовать в Игре только один раз независимо от количества и сумм совершенных покупок.

7. Состав и размер призового фонда и источники его формирования.

Размер призового фонда игры составляет **28 487,52 (двадцать восемь тысяч четыреста восемьдесят семь белорусских рублей 52 копейки)**. Состав призового фонда:

Наименование	Количество, шт.	Стоимость за единицу, бел. руб.	Общая стоимость, бел. руб.
Автомобиль SKODA Rapid Active Тип кузова: седан Тип привода: передний Двигатель: 1600 КПП: 5 ступенчатая МКПП Цвет автомобиля: белый № кузова: XW8AG2NH5JK135253 Год выпуска: 2018	1	**24 800,00**	**28 487,52**
И денежные средства для уплаты налога в размере **3 687,52** белорусского рубля	1	**3 687,52**	

Источником формирования призового фонда Игры являются денежные средства Заинтересованного лица – ООО «Рефорте».

8. Проведение розыгрыша призового фонда.

8.1. Место, дата и время проведения розыгрыша

Розыгрыш призового фонда проводится открыто в присутствии Комиссии по адресу: г. Минск, ул. Лещинского, 4а (офис Республиканского дочернего унитарного предприятия «Белоруснефть – Нефтехимпроект»).

Дата и время проведения розыгрыша: 11 сентября 2018 г. в 16:00.

8.2. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей

8.2.1. Для розыгрыша в установленном порядке формируется список участников (далее – Список).

Каждому Участнику игры, выполнившему условия, указанные в подпункте 6.3 данных правил, присваивается порядковый номер (далее – номер Участника) по номеру Карты «Белоруснефть» в порядке возрастания. Все номера Участников имеют одинаковую разрядность.

8.2.2. Для проведения розыгрыша используется специальный вращающийся непрозрачный барабан и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9.

Определение выигрышного номера Участника происходит путем его формирования поразрядно слева направо из номеров шаров, последовательно извлекаемых из лототрона.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера в барабан помещаются шары с номерами от «0» до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего порядкового номера Участника из Списка. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера Участника.

Далее для определения цифры в следующем разряде формируемого выигрышного номера Участника в барабан загружаются шары с номерами, которые существуют в соответствующем разряде номеров Участников в Списке. Шары перемешиваются, и из барабана извлекается один шар. Номер шара вносится в протокол и записывается в соответствующий разряд формируемого выигрышного номера Участника.

Определение 1 (одного) альтернативного выигрышного номера Участника (альтернативного победителя) происходит следующим образом: альтернативным победителем становится Участник Игры с номером Участника через 6000 номеров от победившего номера Участника.

В случае если выпавший номер Участника находится в конце Списка, то исчисление для определения альтернативного победителя продолжается с начала Списка.

8.2.3. При проведении розыгрыша Комиссией оформляется протокол розыгрыша.

8.2.4. Участники Игры вправе присутствовать при проведении розыгрыша.

9. Срок и способ информирования победителя, место, порядок и срок выдачи выигрыша.

9.1. После проведения розыгрыша Организатор уведомляет победителя о выигрыше по почте, телефону, электронной почте и SMS не позднее 13 сентября 2018 г. включительно.

9.2. Для получения приза победителю необходимо в срок до 18 сентября 2018 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by следующие данные:

9.2.1. для граждан Республики Беларусь, а также иностранных граждан и лиц без гражданства, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь:

– копию страницы 25, страниц 31–33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;

– копию страницы 3, страниц 15–17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;

9.2.2. для иностранных граждан и лиц без гражданства, не имеющих вида на жительство:

– копию паспорта страны, гражданином которой он является (для лиц без гражданства – документ, подтверждающий их личность, выданный в порядке законодательства страны фактического проживания). В случае если данный документ выдан не на государственном языке Республики Беларусь, также заверенный нотариально перевод такого документа на государственный язык Республики Беларусь.

9.3. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т. Победителей, 143, в срок до 20 сентября 2018 г. включительно. Победитель предварительно согласовывает дату и время прибытия за получением приза с Организатором по телефону +375 17 216-80-77.

9.4. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с победителем любым из указанных выше способов, либо победитель не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Белоруснефть», либо победитель отказывается от приза, либо победитель не явился за получением приза, право на приз переходит альтернативному победителю.

9.5. Альтернативный победитель уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону, почте и SMS до 24 сентября 2018 г. включительно. Для получения приза альтернативный победитель, которому перешло право на получение приза, должен до 26 сентября 2018 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by данные, указанные в п. 9.2. правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, 143, в срок до 28 сентября 2018 г. включительно.

9.6. Альтернативный победитель утрачивает право на получение приза если с ним не удается связаться любым из указанных выше способов, либо альтернативный победитель не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Белоруснефть», либо альтернативный победитель отказывается от приза, либо альтернативный победитель не явился за получением приза.

9.7. В случае если победитель (альтернативный победитель) не может приехать за получением приза лично, приз может получить его доверенное лицо по предъявлении копии паспорта либо вида на жительство победителя (альтернативного победителя), своего паспорта либо вида на жительство и нотариально заверенной либо приравненной к таковой доверенности от победителя (альтернативного победителя).

9.8. С момента передачи приза к победителю (альтернативному победителю) переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом. Денежная компенсация стоимости призов не производится. Победитель либо альтернативный победитель (в случае его нежелания получить приз) не вправе передать право на получение приза другому лицу. Приз не подлежит замене.

9.9. В соответствии с законодательством Республики Беларусь при выдаче призов Организатор удерживает и перечисляет в бюджет подоходный налог в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, из суммы денежных средств соответствующего приза. Вручение призов осуществляется за минусом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза.

9.10. Организатор не оплачивает победителю (альтернативному победителю) расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

10. Порядок информирования об условиях и результатах Игры.

10.1. Факт участия в Игре означает, что Участники Игры соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фото-, аудио-, видео- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором и Заинтересованным лицом в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору, заинтересованному лицу.

10.2. Участник Игры, претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Игры для получения приза.

10.3. Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников Игры с настоящими Правилами.

10.4. Правила проведения Игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Игры в газете «Звязда». Информация о результатах розыгрыша публикуется до 26 сентября 2018 г. включительно в газете «Звязда».

10.5. Телефон для справок по вопросам проведения Игры: (МТС – 033, Velcom – 029, Life – 025) 6 431 431 круглосуточно без выходных.

Свидетельство № 3327 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 18.07.2018 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 400/D-5569 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение), площадью 165,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Лермонтова, 8

Начальная цена продажи – 52 387,02 руб. (пятьдесят две тысячи триста восемьдесят семь рублей две копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 5 238 руб. (пять тысяч двести тридцать восемь рублей)

Продавец – Гродненский городской филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 8-0152-52-02-88

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона:
– расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на покупателя;
– право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;
– документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 7 августа 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 20.03.2018 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 1 августа 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

Продавец: ОАО «Витебские продукты», 210041, г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 25, тел. (0212) 65 74 28.

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-94455 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Московский, 64 площадью 1213,1 кв. м, наименование: магазин, назначение: торговое помещение. Обременение: договор аренды до 30.12.2019. Нач. цена: 745 200 бел. руб. без НДС. Задаток: 74 520,00 бел. руб.

Повторный аукцион состоится 27.08.2018 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: с 25.07.2018 с 8.30 по 24.08.2018 до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества; покупатель за свой счет осуществляет гос. регистрацию перехода права собственности на недвижимое имущество, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, BIC MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» от 16.05.2018, 20.06.2018 г.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на р/с, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона производится в порядке и сроки, указанные в договоре купли-продажи. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. С полной информацией о порядке проведения торгов, оформления участия и определения победителя аукциона можно ознакомиться на сайте marketvit.by. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru.

■ Год малой радзімы

«У КОЖНАГА БЫЦЬ ПАВІННА СВАЯ БАРАВІНА...»

Вёска майго дзяцінства... У час канікул, у выхадныя і святы, у кожную вольную хвілінку я бегла сюды, да бабулі з дзядулем. Што ж вабіла ў іх маленькай вёсачцы? Сябры? Кампанія? Не, хутчэй наадварот: гуляла я пераважна адна, бо ні дзяцей, ні моладзі там ужо не было. Але была прырода, былі кнігі. Колькі ж я прачытала іх у лузе пад стракатанне конікаў!

Дзе той луг і тое чароўнае месца?

Амаль на мяжы Уздзенскага і Капыльскага раёнаў, каля шашы. Некалі тут быў вялікі лес і балота, якое потым асушылі.

Адкуль у вёскі назва Слабадскі Чашын? Версій бытуе як мінімум дзве. Паводле першай, некалі гэтае нізкае месца аблюбавалі тры браты са Слабады, а сталі будавацца і знайшлі шмат бітага посуду — керамічных місак, чаш. Таму, калі задумаліся, як жа назваць сваё паселішча, сумненняў не было: Чашын. А Слабадскі — у гонар сябе, першых пасяленцаў.

З другім меркаваннем можна пагадзіцца, калі прыгледзецца да ландшафту: вёска знаходзіцца ў нізіне — нібы ў сапраўднай чашы.

Некалі і перад ёй, і за ёй былі лагчынкі. Адной, на жаль, ужо няма: яе зааралі пад калгасныя палеткі. А вось другая ўсё прыгажэе: там раскідзістая старая вярба, там маладзенькія сосны, што так і вабяць прайсціся паміж імі, пашукаць духмяных маслякоў.

Ёсць за вёскай і два вадаёмы. Каля іх раней сядзелі мясцовыя рыбакі, там жа плавалі свойскія птушкі.

І кароў, помню, трымалі ў кожным дварэ: шторaніцы, збіраючы статак, пастух крычаў сваё: «Выганяй!..» А як жа хораша было пасвіць кароў удваіх з бабуляй! Колькі размоў мы тады правялі, колькі мелі сваіх сакрэтаў!..

Цікава, што ў Слабадскім Чашыне ва ўсе часы жылі носьбіты ў асноўным трох прозвішчаў: Касабуцкія, Дубовікі і Ваўчэцкія; што амаль усе вяскоўцы адзін аднаму даводзіліся раднёй; што жанчын тут называлі па мужу: Тамары былі Васява і Вітолява, Зіна — Алікава, Ала — Сярожава і г. д. Мянушкі ў вёсцы бытавалі таксама, прычым асобныя перадаваліся з пакалення ў пакаленне.

Большасць вяскоўцаў працавала ў калгасе: мужчыны — на трактарах і машынах, жанчыны — на ферме і палетках. Паміж хатамі Васіля Дубовіка і Вітолі Касабуцкага (майго дзядулі) была сапраўдная база: мясцовыя механізатары і шафёры ставілі тут сваю тэхніку. Жыла ў вёсцы і сям'я настаўнікаў. Уладзімір Вячаслававіч і Галіна Фёдараўна Ваўчэцкія ўсё жыццё сваё прысвяцілі школе.

Некалі даўно ў вёсцы, казалі, было весела. У кожнай хаце гадаваліся дзеці — па двое, трое, чацвёра.Тут (і разам!) святкаваліся юбілеі, вяселлі, усёй вёскай хлопцаў праводзілі ў войска, але...

Сёння тут 18 хат, з дзясятак пастаянных жыхароў ды на лета, на адпачынак у бацькоўскія хаты прыязджаюць часовыя. І тады на некалькі месяцаў вёска ажывае...

А ў астатні час пераважна сумуе па сваім ранейшым жыцці. Амаль ніхто не ходзіць праз алешнік вудзіць рыбу, не збіраецца больш каля калодзежа ці аўтакрамы, зарастаюць сцяжынкі і вадаёмы.

Балюча сціскаецца сэрца і ад таго, што ў гэтай вёсачцы ніхто больш не чакае мяне. Не выйдзе бабуля, каб сустрэць ці праводзіць, каб потым доўга стаяць на ўзгорку і махаць мне ўслед...

Але ж вёска мая жыве! Яна ў думках і снах, яна ў марах маіх — Слабадскі Чашын!

Вольга ТРЫГУБОВІЧ,

в. Варацішчы, Уздзенскі раён.

P. S. Пра сябе. «Звязду» чытаю з дзяцінства. Пяць гадоў таму скончыла факультэт беларускай і рускай філалогіі БДПУ імя Максіма Танка, працую настаўніцай пачатковых класаў, люблю спяваць, пішу вершы, апавяданні, нарысы. Буду рада ўбачыць свае творы на старонках любімай газеты

■

■ Бацькі і дзеці

ДЗЕЛЯ СЯМ'І

Суседка мая адну палоўку года жыве ў Мінску, у дачкі, а другую — у вёсцы. Там у яе хатка: яшчэ дзед паставіў, там зямля, сад. А таму як толькі вясна, рвецца жанчына (ёй 83-і пайшоў) дадому, просіць дачку: «Завязі мяне... Печ жа болей паліць не трэба...» І дзе ты дзенешся? Дачка адвозіць, хоць потым і нервуецца: чакае пятніцы, ляціць у вёску да маці.

Прыязджае надоечы, а там, дзякаваць богу, поўны парадак. Нават вішні стаяць спелыя, некранутыя, хоць у горадзе ад іх адны костачкі (і тыя на асфальце) — птушкі ўсё абабралі.

— Хто ж нашы ўратаваў? — пытае яна ў матулі.

Тая сціпла так:

— Я падмітусілася. Папрасіла суседа Гену, каб пудзіла зрабіў. Рукасты ён хлопец. Да вялікай рэйкі прыбіў папярочку, на «тулава» надзеў рыбацкую куртку, з вялікага буталя ад вады галава атрымалася, да рукавоў нейкіх бліскучых дыскаў начапляў, каб матляліся і шнурок яшчэ прывязаў, прапусціў яго пад курткай — аж да ручкі акна... Паставілі мы вартавога, так што мне засталося толькі ў акно пазіраць, за шнур той торгаць ды свістаць час ад часу... Я ведаю, чаму птушкі свісту баяцца: гэта ж каршун, калі зверху кідаецца, паветра са свістам рэжа... Для гэтага я свісток міліцэйскі знайшла. Пасля вайны ім бандытаў адпуджвалі, а цяпер — бач — птушак... Мы гэта пудзіла яшчэ і да грушы потым прыладзім, Гена абяцаў... Можа, таксама ўраджай уратуем?.. Усё ж карысць, а ты мяне адвозіць не хацела...

Праўду людзі кажуць: на дзетак маці батрачка, пакуль рук не сашчэпіць. Нават не могучы нешта рабіць, яна хоча быць карыснай для сваіх дзяцей, для сям'і.

Л. Міхайлава,

г. Мінск

■

■ Чалавек — чалавеку

УРОКІ ДАБРЫНІ

Дзяцінства, апаленае вайной, — гэта пра Георгія Сямёнавіча Касцюкевіча, бо нарадзіўся ён у партызанскім атрадзе, бо першую сям'ю ягонага бацькі спалілі немцы. Можа, таму і сам ён пажыў зусім нядоўга: маці гадавала сына адна, так што хлопчыку хапіла і голаду, і холаду...

Пасля заканчэння Мінскага педінстытута ды службы ў войску ён быў абраны першым сакратаром Чэрвеньскага райкама камсамола, працаваў у яго цэнтральным камітэце і Мінскім аблвыканкаме, выкладаў у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце. І пры гэтым Георгій Сямёнавіч праз усё жыццё сваё памятаў землякоў, памятаў сваю малую радзіму.

Спадзяёмся, што яго ўспаміны, яго «Урокі дабрыні», над якімі ён карпатліва працаваў у апошнія месяцы свайго жыцця, будуць цікавыя і карысныя для чытачоў «Звязды».

Такім чынам

Урок першы

Наша Парэцкая сямігадовая школа знаходзілася на рацэ Пціч, і зімой, у перапынках паміж урокамі, дзятва любіла пакатацца там з высокага берага.

Але ж вось званок — вучні паімчалі на заняткі. Я, увесь мокры і стомлены, плёўся ў клас апошнім.

У школьным калідоры і вось такім мяне ўбачыла старэнькая тэхнічка, абтрэсла з вопраткі снег, прыгладзіла ўскудлачаныя валасы і сказала:

— Я ведала твайго бацечку. Ён быў добрым чалавекам. Ён уратаваў мяне ад благіх людзей у гады вайны: не даў забраць маю карміцельку — швейную машынку.

З гэтымі словамі жанчына разгарнула нейкую паперу, дастала з яе адзіную лусту чорнага хлеба, пасыпанага соллю і палітага алеем, і працягнула мне:

— Вазьмі, дзіцятка, з'еш. Гэта за бацьку.

Якой жа смачнай была тая луста! Як я быў рады ёй! Бо разумеў, што гэта не проста хлеб, гэта — узнагарода... За бацьку-партызана... Мне.

Потым у маім жыцці іх было шмат... Як і розных захапляльных момантаў ды ўражанняў, аднак першая ў памяці назаўжды.

Урок другі

У 1962 годзе наш Акцябрскі раён быў скасаваны, яго тэрыторыя ўвайшла ў склад Светлагорскага. Туды, у свой новы райцэнтр, і давялося мне ехаць па метрыку — пасведчанне аб нараджэнні.

Усё патрэбнае пры сабе я меў, таму дакумент у загсе мне справілі хутка. А вось з аплатай яго здарылася замінка. Грошай у мяне хапала на нешта адно: альбо на аплату пасведчання, альбо на зваротны білет.

Няёмка было ў гэтым прызнацца, але ж нідзе не дзенешся...

Добра, што загадчыца загса ўсё зразумела. Яна распарадзілася выдаць мне дакумент бясплатна і, усміхнуўшыся, дадала: «Заробіш — аддасі».

Дзякуючы гэтаму рашэнню я купіў білет, з новым пасведчаннем дабраўся дадому і дабрыню той загадчыцы помніў усё жыццё.

Урок трэці

Той далёкай восенню нас, вучняў Парэцкай школы, адправілі на ўборку калгаснай бульбы. Мы паселі ў машыну і паехалі, аднак па дарозе грузавік зламаўся. Мы выйшлі і сталі чакаць, пакуль яго паправяць...

У гэты час да нас пад'ехала старшыня калгаса. Папрасіўшы ўвагі, яна сказала:

— Дарагія памочнікі! Вы бачыце, якое сонечнае, цёплае надвор'е. У такое, згадзіцеся, — сама працаваць! Але ж вашу машыну адрамантуюць не хутка... Дык мо давайце наперагонкі? А ну — хто хутчэй дабяжыць да бульбянога поля?

Мы нічога не паспелі сказаць, бо старшыня ўжо сарвалася з месца і пабегла. Ды так лёгка і прыгожа...

Хвілін праз дзесяць усе мы былі на полі, пасталі ў барозны. Старшыня паабяцала, што за добрую працу на Новы год мы атрымаем цукеркі ды іншыя падарункі. Гэта — хоць і далёкі — але ж быў стымул!

У канцы дня старшыня прыехала зноў і, убачыўшы, колькі мы паспелі зрабіць, шчыра пахваліла нас і падзякавала. А галоўнае, што слова наконт цукерак і падарункаў яна таксама стрымала.

Урок чацвёрты

У 1968 годзе ў свет выйшла аповесць С. І. Грахоўскага «Рудабельская рэспубліка». І я, на той час ужо настаўнік гісторыі, разам з вучнямі старэйшых класаў вырашыў правесці па гэтай кнізе чытацкую канферэнцыю, запрасіць на яе ўдзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, папрасіць іх падзяліцца ўспамінамі.

Да гэтага мерапрыемства зала нашага клуба была аздоблена галінкамі бярозы і клёну, адмыслова сплеценай гірляндай з елкі, дзеразы і жывых кветак. Людзей сабралася шмат, канферэнцыя ўдалася на славу!

Старшыня Парэцкага сельскага выканкама Ніна Сямёнаўна Касцюкевіч напісала аб гэтым у раённую газету «Чырвоны Кастрычнік», падзякавала за ўдзел ветэранам, назвала пайменна арганізатараў мерапрыемства.

Для некага з нас гэта было ўзнагародай, для некага — штуршком для вызначэння далейшага жыццёвага шляху. Для мяне ж імёны гасцей ды ўдзельнікаў канферэнцыі ўсё жыццё гучалі, як музыка цёплага вясновага дажджу. Я рады, што чуў гэтых людзей, што бачыў іх.

«Урокі дабрыні» — ад школьнай тэхнічкі, загадчыцы загса, старшынь калгаса і сельсавета, ад жанчын, прызваных любіць і выхоўваць. Буду рады, калі іх учынкі паслужаць прыкладам для паводзінаў, калі мае ўспаміны дапамогуць хоць некаму падабрэць душой.

Даслалі Ларыса Іванаўна і Андрэй Георгіевіч КАСЦЮКЕВІЧЫ.

г. Мінск

■

■ Спявай, душа!

«Крыж свой дзеду цяжка несці, Трэба, людцы, памагчы...»

«Звязда» збірала і збірае прыпеўкі. Чытайце і спявайце чужыя, дасылайце свае.

Усё краклала цётка Рая,
Што ёй цяжка, бо старая.
Дзеда ў прымы ўзяла,
Як малодка зажыла!

Кажа Раі гэты дзед:
Хачу снеданне, абед,
Чарку зранку і ў вячэру
Ды яшчэ адну халеру.

Сваіх мопсікаў мадамы
Прыбіраюць крута:
Ім то курткі, то піжамы,
А мужык разуты.

Да вяселля так кахаюць,
Што насілі б на руках!
А пасля ўжо бывае
Носяць і на кулаках.

Нарасло ў цёткі вішань,
Але ж не паспелі:
Наляцелі вераб'і —
За гадзіну з'елі.

Крыж свой дзеду цяжка несці,
Трэба, людцы, памагчы:
Бо ён мае нешта з'есці,
Ды даўно не мае чым.

Прадаўцы ў гэтай краме
Віскаталі, нібы ў драме.
А цяпер, каб што прадаць,
Нас гатовы абдымаць.

Вы не ешце рыб жывых
З мораў-акіянаў,
Там са смецця астравы.
Там усё... забруджана.

Мала люду ў Беларусі,
Вёска вымірае.
Па-над ёй кружляе бусел —
Дзетак не кідае.

Соф'я КУСЯНКОВА,

в. Лучын, Рагачоўскі раён

■

■ Дзяржаўная дапамога

5 пытанняў аб тэхнічных сродках сацыяльнай рэабілітацыі

Міністэрства працы і сацабароны адказала людзям з інваліднасцю

У Беларусі на сёння пражывае амаль 566 тысяч людзей з інваліднасцю, і іх колькасць з кожным годам, на жаль, не змяншаецца. Многія маюць патрэбу ў пратэзах, бандажах, слыхавых апаратах і інвалідных калясках. І не ўсе ведаюць, куды звяртацца па іх і хто можа ім дапамагчы.
Нядаўна на пытанні, звязаныя з забеспячэннем тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, падчас анлайн-канферэнцыі адказалі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК, начальнік упраўлення па справах інвалідаў Аляксандра ШАЎЦОВА і кансультант упраўлення па справах інвалідаў Тамара ГАРДЗЕНЯ.

— З'яўляюся інвалідам II групы, баляць ногі, хачу атрымаць артапедычны абутак і кій, але не ведаю, куды трэба звяртацца...

Тамара Гардзеня:

— У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку забеспячэння грамадзян тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, зацверджаным пастановай Саўміна ад 11.12.2007 № 1722, інваліды II групы забяспечваюцца артапедычным абуткам і кіем бясплатна за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў.

Артапедычны абутак выдаецца ў колькасці адной пары ў каляндарным годзе, а апорны кій для перамяшчэння хворых з парушэннямі функцый ніжніх канечнасцяў выдаецца на два гады.

У Дзяржаўны рэестр тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі ўваходзяць крэсла-каляска з электрапрывадам, апорны кій, матрац спецыяльны супрацьпролежневы, пратэзы верхніх і ніжніх канечнасцяў, бандажныя вырабы, слыхавыя апараты і многія іншыя прадметы (усяго 72 пазіцыі), якія значна палягчаюць жыццё людзям з абмежаванымі магчымасцямі.

Пры наяўнасці індывідуальнай праграмы рэабілітацыі інваліда ці заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя аб патрэбе ў артапедычным абутку і кіі вы можаце іх атрымаць у РУП «Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр» (ці яго філіялах) у адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання). Галаўное прадпрыемства цэнтра знаходзіцца па адрасе: г. Мінск, вул. Адоеўскага, д. 10. Тэлефоны для даведак 308 14 32, 308 14 33.

— На якія сродкі рэабілітацыі могуць разлічваць інваліды I і II груп па зроку?

Тамара Гардзеня:

— У адпаведнасці з заканадаўствам, інваліды I і II групы, у тым ліку па зроку, забяспечваюцца бясплатна і на льготных умовах сродкамі рэабілітацыі, уключанымі ў Дзяржаўны рэестр (пералік) тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, які ў цяперашні час уключае ў сябе 72 найменні розных сродкаў.

У Дзяржаўным рэестры для інвалідаў па зроку прадугледжаны такія тыфлатэхнічныя сродкі рэабілітацыі, як дыктафон (плэер), мабільныя тэлефоны, у тым ліку з праграмным забеспячэннем, якое сінтэзуе гаворку, і (або) з функцыяй навігацыі (смартфоны); прылада для праслухоўвання агучанай літаратуры (плэер), гадзіннік з сінтэзатарам гаворкі.

Выдаюцца сродкі рэабілітацыі, у тым ліку тыфлатэхнічныя, на падставе індывідуальнай праграмы рэабілітацыі інваліда ці заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

Звяртацца па атрыманне тыфлатэхнічных сродкаў неабходна ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання).

— У сувязі з хваробай не магу хадзіць, жонцы цяжка мяне даглядаць. Ці магу я атрымаць крэсла-каляску?

Аляксандр Румак:

— У адпаведнасці з заканадаўствам, крэслы-каляскі выдаюцца інвалідам I групы бясплатна на падставе індывідуальнай праграмы рэабілітацыі інваліда ці заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

У выпадку адсутнасці інваліднасці вы можаце, пры наяўнасці неабходных дакументаў, узяць каляску ў пункце пракату ў тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства.

Для вырашэння пытання атрымання крэсла-каляскі неабходна звяртацца ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання).

— З'яўляюся інвалідам II групы па зроку. Зараз вучуся ў ВНУ, на вочнай форме навучання. Хацелася б мець сучасны тэлефон. Ці магу я яго атрымаць і на якіх умовах?

Тамара Гардзеня:

— У адпаведнасці з заканадаўствам, інваліды II групы па зроку забяспечваюцца смартфонам з аплатай 20 % кошту дадзенага сродка рэабілітацыі на падставе індывідуальнай праграмы рэабілітацыі інваліда ці заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

Па стане на 1 мая 2018 года ў нашай краіне пражывала 565 920 людзей з інваліднасцю, у тым ліку 31 471 дзіця-інвалід ва ўзросце да 18 гадоў.

Смартфоны набываюцца камітэтамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў на конкурснай аснове ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Камітэты з дня набыцця смартфонаў выдаюць іх грамадзянам у парадку чаргавасці, што вызначаецца ў залежнасці ад даты падачы заявы, не пазней за 15 рабочых дзён пасля ўнясення частковай платы з улікам устаноўленых ільгот.

З улікам выкладзенага, па атрыманне смартфона вам неабходна звяртацца ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання).

— Хто і па якіх крытэрыях вызначае марку мабільнага тэлефона, які выдзяляюць для інвалідаў па зроку? Хто вызначае гэтыя крытэрыі? Як пры такім падыходзе ўлічваюцца індывідуальныя патрэбы інваліда? Ці магчыма атрымаць грашовую кампенсацыю на куплю мабільнага тэлефона і спецыяльных праграм для яго? Чаму інваліду па зроку тэлефон выдзяляецца на 10 гадоў, калі яго тэрмін службы не больш за пяць гадоў?

Тамара Гардзеня:

— У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку забеспячэння грамадзян тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, інваліды I і II груп па зроку забяспечваюцца смартфонамі з аплатай 20 % кошту дадзенага сродку рэабілітацыі. Пры гэтым 80 % кошту, г. зн. большая частка, аплачваецца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў. Камітэты па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама набываюць смартфоны на конкурснай аснове ў парадку, устаноўленым заканадаўствам. Выбар крытэрыяў і мадэляў смартфонаў вызначаюць камітэты па ўзгадненні з грамадскімі аб'яднаннямі інвалідаў па зроку. У цяперашні час грашовая кампенсацыя на куплю мабільнага тэлефона не ажыццяўляецца. Пытанне аб пераглядзе тэрмінаў эксплуатацыі смартфонаў будзе разглядацца пры ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову № 1722

■ Без бар'ераў

МОЛАДЗЬ ЗАПРАШАЮЦЬ НА «КРУГЛАЕ ВОЗЕРА — 2018»

Маладыя людзі ад 18 да 35 гадоў (у тым ліку і тыя, у каго ёсць фізічныя абмежаванні) правядуць 10 займальных і пазнавальных дзён у час летняга інтэграцыйнага палатачнага лагера-семінара «Круглае возера — 2018», які пройдзе з 4 па 14 жніўня.

Унікальная адукацыйная праграма, а таксама паходная лазня, гітара і барабаны, новыя сябры і шчырыя размовы каля вогнішча... «Наш лагер — гэта маленькае жыццё ў лесе, на беразе возера, удалечыні ад гарадской мітусні. Гэта «адкрытая прастора», дзе дзейнічаюць толькі тыя правілы, якія маладыя людзі ўстанаўліваюць для сябе самі», — паведамілі нам у Беларускім маладзёжным грамадскім аб'яднанні «Розныя-Роўныя», якое з'яўляецца арганізатарам «Круглага возера — 2018».

Падчас адукацыйнай праграмы лагера-семінара маладыя людзі будуць гаварыць пра бар'еры, якія ўскладняюць узаемадзеянне людзей з інваліднасцю і без яе, паспрабуюць разабрацца, як стэрэатыпы і забабоны ўплываюць на якасць жыцця моладзі. Гаворка будзе ісці і аб інклюзіі, і аб тым, што яна датычыцца кожнага сучаснага чалавека.

Увогуле, арганізатары абяцаюць цікавыя дыскусіі, ролевыя гульні, форум-тэатр і многае іншае. Іх мэта — навучыць удзельнікаў лагера прымаць розных людзей такімі, якія яны ёсць, пазбягаючы забабонаў і ўмоўнасцяў, а таксама — адкрыта выказваць сваё меркаванне і праяўляць ініцыятыву, прымаць рашэнні і ўсведамляць наступствы сваіх дзеянняў, вырашаць канфліктныя сітуацыі, ператвараючы іх у новы карысны вопыт. Таксама арганізатары ўзялі на сябе дастаўку ўдзельнікаў з Мінска да лагера і забеспячэнне іх харчавання і пражывання

ЯК ВЯРНУЦЬ «ЖЭСТ» У ЭФІР?

СМІ павінны быць максімальна даступныя людзям з абмежаванымі магчымасцямі

У Беларусі будзе распрацавана канцэпцыя абнаўлення тэлеканала «Жэст». З гэтай мэтай ствараецца рабочая група, у склад якой увойдуць прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі, кабельных аператараў, самога тэлеканала. У далейшым падключацца прадстаўнікі Мінпрацы і сацабароны і Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Гаворка пра гэта ішла на пасяджэнні круглага стала «Жэст добрай волі», прысвечанага пытанням развіцця ў краіне інклюзіі і камфортнага асяроддзя для інвалідаў.

«Жэст» — гэта спецыялізаваны тэлеканал для людзей з парушэннямі слыху. Ён пачаў сваё вяшчанне ў 2009 годзе. З 2010-га трансляваўся ў сетках буйных кабельных аператараў. Цяпер перад ім стаяць вострыя фінансавыя праблемы: састарэлае абсталяванне, складанасці з закупкай і стварэннем новага кантэнту, адсутнасць плошчаў для размяшчэння. З ліпеня тэлеканал часова прыпыніў вяшчанне. Разам з тым, па словах яго прадстаўнікоў, яны атрымліваюць шмат лістоў ад гледачоў з просьбамі вярнуць тэлеканал у эфір.

Рэжысёры тэлеканала «Жэст» Злата КАРПІЕВІЧ і Ягор БЯКАЎ прапануюць на аснове «Жэста» стварыць праект сямейнага тэлеканала «Мы», істотна пашырыўшы пры гэтым мэтавую аўдыторыю. Яны прапануюць трансляваць тэлеканал праз інтэрнэт, кабельнае і спадарожнікавае вяшчанне на рускай і беларускай мовах. А ў сетку вяшчання хочуць уключыць дакументальныя фільмы пра беларускія таленты, аб людзях з няпростым лёсам, забаўляльныя шоу ўласнай вытворчасці. Пры гэтым плануецца, што ўвесь кантэнт будзе забяспечаны субцітрамі, а таксама будзе выкарыстоўвацца сурдаперакпад, каб людзі з праблемамі зроку і слыху мелі поўны доступ да інфармацыі.

Першы намеснік міністра інфармацыі Павел ЛЁГКІ паведаміў, што прадугледжваецца забяспечыць схаванымі субцітрамі ўвесь абавязковы агульнадаступны пакет тэлепраграм.

— Дзякуючы спецыяльна закупленым серверам і новаму абсталяванню Белтэлерадыёкампанія ўжо забяспечыла суправаджэнне свайго тэлевізійнага кантэнту схаванай функцыяй тэлесуфлёра, — сказаў Павел Лёгкі. — У прынцыпе, такая ж работа вядзецца асноўнымі рэспубліканскімі тэлеканаламі. Спадзяёмся, што мы здолеем забяспечыць гэтай функцыяй агульнадаступны пакет.

Разам з тым пакуль што не ўсе кабельныя тэлеаператары ўключылі такі сэрвіс у пералік сваіх паслуг, з прычыны чаго людзі з праблемамі слыху не могуць у поўнай меры скарыстацца магчымасцямі схаванага субцітравання. Акрамя таго, жэставая мова не абмяжоўваецца толькі гэтай функцыяй. А для людзей з парушэннем зроку трэба ўжываць аўдыядэскрыпцыю — лаканічнае апісанне прадмета, месца або дзеяння, якія незразумелыя тым, хто слаба бачыць, без спецыяльных слоўных тлумачэнняў. Таксама неабходна больш шырока выкарыстоўваць ясную мову, даступную людзям, якія маюць цяжкасці з чытаннем і разуменнем тэксту.

Кантэнт усіх відаў СМІ павінен быць максімальна даступны для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, лічыць першы намеснік міністра інфармацыі. Што датычыцца тэлеканала «Жэст», то, па словах Паўла Лёгкага, цяпер заканадаўства не прадугледжвае ўдзелу дзяржавы ў бюджэтнай падтрымцы гэтага праекта. Разам з тым ён адзначае, што ў Міністэрства інфармацыі ёсць некаторыя ідэі, як можна было б паспрабаваць гэта зрабіць. Першы намеснік міністра лічыць, што трэба вярнуць тэлеканал «Жэст» у эфір, а далей абмяркоўваць пытанні яго рэбрэндынгу і фінансавыя крыніцы існавання тэлеканала

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

ЦІ ЁСЦЬ У ВАРЭННІ ВІТАМІНЫ?

Летам многія гаспадыні бяруцца кансерваваць агародніну, фрукты і ягады, рэдка задумваючыся пра тое, ці захоўваюцца ў дамашніх нарыхтоўках карысныя ўласцівасці прадуктаў.

Нямала дастаецца варэнню, маўляў, ніякіх вітамінаў у ім няма. У якасці альтэрнатывы некаторыя раяць выкарыстоўваць замарозку. Але і тут узнікае пытанне: ці застануцца ядомымі маліны, агрэст і яблыкі пасля шматмесячнага знаходжання ў маразілцы звычайнага бытавога халадзільніка?

Ёсць меркаванне, што варэнне з вішняў дапамагае пры прастудзе, з абрыкосаў — аднаўляе страваванне, з груш — паляпшае састаў крыві. Лічыцца, што есці варэнне можна без боязі атруціцца, бо ў працэсе яго прыгатавання гіне большасць мікробаў, а цукар дазваляе прадукту захоўвацца некалькі гадоў.

Але ці знікаюць падчас прыгатавання вітаміны? Яны захоўваюцца, праўда не ўсе. Большасць фруктаў і ягад, з якіх яго гатуюць, славяцца вялікай колькасцю бэта-караціну (папярэдніка вітаміну А), аскарбінавай кіслаты (вітаміну С), вітамінаў В1, В2 і РР. Дык вось бэта-каратцін і аскарбінавая кіслата пад уздзеяннем высокіх тэмператур часткова разбураюцца. Таму ў варэнні, якое кіпяціцца па некалькі разоў, гэтых вітамінаў сапраўды мала. А вось вітаміны В1, В2, РР і Е з'яўляюцца дастаткова тэрмастабільнымі. Асабліва ў кіслым асяроддзі, якім з'яўляецца варэнне. Невялікая іх частка пры кіпенні разбураецца, але асноўная колькасць захоўваецца. Таму карысць у варэнні ўсё ж ёсць.

ЯК ПАЗБЕГНУЦЬ ХАРЧОВАГА АТРУЧВАННЯ

І як мы самі распаўсюджваем небяспечныя бактэрыі па кухні

Ялавічына, малочка, яйкі, рыба і фрукты — акрамя халадзільніка і абедзеннага стала, іх аб'ядноўвае сумная статыстыка харчовых атручванняў.

Нярэдка прычынай недамагання становяцца брудныя рукі. Бо адны з самых частых «пасажыраў» далоняў — гэта ўзбуджальнікі гепатыту А, герпесу, дызентэрыі, грыпу. Важна правільна мыць і самі прадукты. Напрыклад, курыцу. На яе мясе часта жывуць лістэрыі. Гэтыя бактэрыі могуць выклікаць гнойны менінгіт, эпілепсію, паўплываць на развіццё плода ў цяжарных, прыводзячы да гідрацэфаліі. Лістэрыі вельмі жывучыя і рухомыя. Калі інфіцыраваную птушку пакласці на пару гадзін у халадзільнік, лістэрыямі будуць заражаныя і ўсе астатнія прадукты.

У топ самых небяспечных з пункту гледжання цяжару і частаты атручванняў уваходзяць курыныя яйкі. Аднойчы да іх дакрануўшыся, трэба старанна мыць рукі, каб не падхапіць сальманелу.

Прадукты з тэрмінам захоўвання, які скончыўся, не менш небяспечныя. У кожнай прыгатаванай стравы ёсць свой тэрмін прыдатнасці. Боршч захоўваецца не больш за сем дзён. Смажаныя катлеты — 36 гадзін. Большасць салатаў з цяжкасцю пратрымаюцца суткі. Вінегрэт, напрыклад, пракісне ужо праз 18 гадзін. Таксама важна правяраць тэрміны прыдатнасці каля прылаўка перад пакупкай.

ЧЫМ НЕБЯСПЕЧНЫ ВІРУС ПАПІЛОМЫ ЧАЛАВЕКА

У віруса папіломы чалавека (ВПЧ) некалькі соцень штамаў. Некаторыя з іх не наносяць ніякай шкоды арганізму чалавека, а некаторыя могуць выклікаць анкалагічныя хваробы ў жанчын. Як ад яго засцерагчыся і выявіць, у якіх выпадках вірус знікае сам, а ў якіх прыходзіцца дапамагчы яму пакінуць арганізм, чаму мэтазгодна прышчэпліваць ад яго дзяўчынак, расказала ўрач-гінеколаг 2-й Цэнтральнай раённай паліклінікі Мінска Аляксандра БУРГУТА.

— Аляксандра Дзмітрыеўна, ці ёсць нейкія сімптомы, калі чалавек заразіўся ВПЧ?

— Кожны штам ВПЧ мае свае праявы. Асобныя віды выклікаюць скурныя праявы — папіломы, кандыломы, анагенітальныя бародаўкі — тое, што можа заўважыць сама жанчына ці ўрач любой спецыяльнасці, які яе аглядае. Найбольшую небяспеку для жаночага здароўя ўяўляюць ВПЧ так званай высокай канцэрагеннай рызыкі. Гэта некалькі дзясяткаў штамаў, вылучаных у пэўную групу. Менавіта яны, на жаль, не даюць ніякіх клінічных сімптомаў. Іх выяўляюць толькі з дапамогай лабараторнай дыягностыкі і спецыяльнага гінекалагічнага абследавання, якое ўключае мазкі на цыталогію, на атыпічныя клеткі, кальпаскапію. Пэўныя сімптомы падчас такога даследавання даюць падставу ўрачу-гінеколагу западозрыць ВПЧ высокай канцэрагеннай рызыкі. Тады для ўдакладнення дыягназу мэтазгодная малекулярная дыягностыка метадам ПЦР, які дазваляе выявіць наяўнасць штамаў і колькасць віруса ў біяматэрыяле.

— Як вірус трапляе ў наш арганізм?

— Выключна палавым шляхам. Усе гісторыі пра тое, што ВПЧ высокай канцэрагеннай рызыкі можна заразіцца ў басейне ці лазні, — вялікі міф. Тыя штамы, якія маюць скурныя праяўленні ў выглядзе бародавак, папілом, тэарэтычна могуць перадавацца кантактным шляхам — праз сродкі агульнай гігіены, у лазні, басейне. Вірус высокай канцэрагеннай рызыкі — толькі палавым шляхам. Прычым, як правіла, жанчына ў першыя гады свайго палавога жыцця ўжо мае кантакт з ВПЧ.

— Здаецца, пасля першага кантакту з гэтым вірусам адбываецца самавылячэнне...

— Гэта залежыць ад стану імунітэту жанчыны. Як правіла, на працягу года ў 90 % жанчын адбываецца самаілюмінацыя — арганізм самастойна пазбаўляецца ад віруса. Калі гэтага не адбываецца, вірус пераходзіць у так званую персістыруючую (хранічную) форму, чалавек становіцца яго носьбітам, і такія пацыенты павінны быць на ўзмоцненым кантролі ўрача.

— Прэзерватыў абараняе ад ВПЧ?

— Апошнім часам гэту гіпотэзу падвяргаюць сумненню. Вірус занадта маленькі, а поры латэксу занадта вялікія. Прэзерватыў у гэтай сітуацыі не дае стапрацэнтнай гарантыі.

— Як тады засцерагчыся ад віруса?

— У многіх развітых краінах Еўропы, у Канадзе і ЗША ў нацыянальных прышчэпкавых календарах маецца прышчэпка ад ВПЧ. У некаторых краінах яна робіцца толькі дзяўчынкам. У іншых, напрыклад у Канадзе, вакцынуюць яшчэ і хлопчыкаў, каб зменшыць колькасць носьбітаў віруса. Тут вялікае значэнне мае ўзрост, ёсць сэнс рабіць такую прышчэпку ва ўзросце ад 6 да 11 гадоў — да меркаванага палавога дэбюту падлетка. Да першага кантакту з вірусам дзіця павінна быць імунізавана. Тут дзейнічае той жа прынцып, як і, скажам, з краснухай: калі ты на яе перахварэў, няма сэнсу рабіць прышчэпку. Ёсць і другасная прафілактыка. Трэба захоўваць гігіену палавога жыцця: мець як мага менш палавых партнёраў. Чым больш палавых партнёраў у жанчыны, тым большая рызыка атрымаць ВПЧ, а таксама іншыя інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам і ствараюць добрую глебу для пранікнення віруса. У жанчыны з хламідыёзам і некаторымі іншымі інфекцыямі эпітэлій пашкоджаны, і гэта стварае спрыяльныя ўмовы для пранікнення ВПЧ. З інфекцыямі больш шанцаў атрымаць і хранічную форму ВПЧ.

— Дарослым жанчынам ёсць сэнс рабіць такую прышчэпку?

— Не.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— У нашай краіне прышчэпкі пакуль няма ў нацыянальным календары, але іх робяць на платнай аснове...

— Так, вакцыны ёсць амаль ва ўсіх буйных цэнтральных паліклініках, і пакуль прышчэпкі робяцца на платнай аснове. У Беларусі дзве зарэгістраваныя вакцыны: Цэрварыкс і Гардасіл. Цэрварыкс дзейнічае супраць крышачку большай колькасці штамаў, у Гардасіла больш пераканальная «доказная база». Але абедзве вакцыны працуюць.

— Ці варта выдаляць папіломы, кандыломы, якія з'яўляюцца у выніку ўздзеяння віруса?

— Тут усё індывідуальна. Ацэньваецца іх колькасць, наколькі моцна яны турбуюць пацыентку. Калі вобласць высыпання значная, напэўна, выдаленне мае сэнс. Але першапачаткова жанчынам рэкамендуюць варыянты кансерватыўнай тэрапіі для стымулявання ўласнага імунітэту. Папіломы часткова ці цалкам знікаюць, а астатак можна выдаляць.

— Ад віруса можна пазбавіцца з дапамогай тых жа імунамадулятараў?

— Тут тры варыянты развіцця падзей. Альбо імунітэт з вірусам спраўляецца самастойна, паралельна фарміруючы пэўную ўстойлівасць. Альбо мы дапамагаем імунітэту раслінными ці штучнымі прэпаратамі, бо, на жаль, таблеткі ці свечкі ад гэтага віруса няма, і ўплываць на яго мы можам, толькі ўздзейнічаючы на імунітэт. Трэці варыянт датычыць выпадкаў, калі ВПЧ высокай канцэрагеннай рызыкі пачаў рабіць сваю разбуральную справу на шыйцы маткі, з'явіліся перадракавыя захворванні, тая ж дысплазія шыйкі маткі ці лейкаплакія шыйкі маткі. У такім выпадку размова будзе ісці аб дэструктыўным лячэнні. Пашкоджаныя вірусам участкі мы разбураем тым ці іншым фізічным метадам — з дапамогай радыёхваляў, лазера, крыядэструкцыі. І прызначаем імунастымулюючую тэрапію.

— Вірус, калі яго не лячыць, выклікае рак шыйкі маткі?

— Многія жанчыны, у якіх знаходзяць ВПЧ, паддаюцца паніцы, быццам бы яны абавязкова захварэюць на рак шыйкі маткі. Але тут доказ ад адваротнага: больш за 90 % жанчын, якія маюць плоскаклетачны рак шыйкі маткі, з'яўляюцца носьбітамі ВПЧ. Але далёка не кожная жанчына, якая мела ці мае ВПЧ, захварэе на рак шыйкі маткі.

— Ці варта спецыяльна на яго правяраца?

— Так, правярацца трэба, прычым мэтазгодна гэта рабіць на штамы высокай канцэрагеннай рызыкі. У лабараторыях яны аб'яднаныя ў асобную групу. Праводзіцца малекулярна-генетычны аналіз для іх выяўлення. На цяперашні момант гэта паслуга платная, за выключэннем некаторых груп насельніцтва, у прыватнасці цяжарных жанчын. Такі аналіз праводзіцца, калі браць Мінск, у скурна-венералагічным дыспансеры, некаторых дзяржаўных паліклініках і шпіталях на камерцыйнай аснове і ў камерцыйных цэнтрах.

— Калі вірус выяўлены, як дзейнічаць?

— Звярнуцца да гінеколага, які абследуе, прызначыць кальпаскапію шыйкі маткі. Калі паталогій не выяўлена, праз год даследаванне варта паўтарыць, бо, як я казала раней, ёсць вялікія шанцы, што за год арганізм справіцца з вірусам самастойна.

Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Торговый дом «Речицкий» (продавец) извещает о проведении 9 августа 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в г. Гомеле по ул. Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
